ПЫТАННЕ НУМАР АДЗІН — ЗАРПЛАТА БЮДЖЭТНІКАЎ 2

ЗАКОНЫ ДЛЯ ЭКАНОМІКІ

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

28 СНЕЖНЯ 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 250 (28866)

9-24 стар.
МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

СВЯТА ПРЫХОДЗІЦЬ У КОЖНАЕ СЭРЦА

Акцыя «Нашы дзеці» сабрала ў Палацы Рэспублікі каля 2400 хлопчыкаў і дзяўчатак з розных куткоў краіны на навагодняе свята. Шыкоўна апранутыя, яны вадзілі карагоды, танчылі і глядзелі святочнае прадстаўленне. Павіншаваць іх прыйшоў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт сказаў, што гэта хвалюючa — прысутнічаць на такіх мерапрыемствах: «Нішто ў жыцці не прыносіць такую радасць, як магчымасць падарыць дзецям казку, убачыць усмешку і радасць пасля зробленага ў вачах дзяцей. Для мяне як Прэзідэнта гэта шчасце — у мільёнах дзяцей, якія жывуць у нашай краіне».

Звяртаючыся да ўдзельнікаў свята, кіраўнік дзяржавы адзначыў: «Вы — галоўны здабытак нашай Беларусі. Гэта не проста прыгожыя словы. За гэтымі словамі — шчырая любоў, жаданне клапаціцца, абараняць. Гэта натуральныя эмоцыі, якія выклікаюць нашы малыя і дзеткі старэйшыя. Для мяне няма нічога важнейшага, чым ваша мірнае і шчаслівае дзяцінства».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэта шчасце, калі дзеці жывуць у мірнай краіне, могуць разлічваць на сваю сям'ю, на старэйшых таварышаў. Прэзідэнт лічыць, што дзяцінства губляецца, калі з-за неразбярыхі, якую дапускаюць дарослыя, малыя жывуць і бачаць выбухі ад бомбаў і снарадаў. «Мы павінны зрабіць усё, каб мірнае дзяцінства было ў вас, тады

Фота БелТА.

і ў вашых дзяцей будзе такое ж мірнае і шчаслівае дзяцінства», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт, звяртаючыся да юных гасцей, сказаў, што дарослыя ганарацца імі, іх паспяховым удзелам у шматлікіх міжнародных конкурсах, спаборніцтвах, алімпіядах. «Было прыемна даведацца, што маленькія жыхары нашай краіны актыўна ўключыліся ў мерапрыемствы, звязаныя з Годам малой радзімы, зрабілі шмат добрых спраў у сваіх гарадах, сёлах, вёсачках, каб добраўпарадкаваць іх», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Наперадзе ў вас яшчэ шмат цікавага, захапляльнае жыццё, — звярнуўся Прэзідэнт да маленькіх гледачоў. — Заўсёды будуць з вамі блізкія людзі, гатовыя падставіць плячо, акружыць вас цеплынёю і ўвагай. І вельмі хочацца, каб вы разумелі вартасць усяго таго, што падарыў вам лёс, — самога жыцця і незалежнай краіны, мірнага неба, добрых людзей, якія ў патрэбны момант сустрэліся і будуць пастаянна сустракацца на вашым доўгім шляху».

Аляксандр Лукашэнка пажадаў усім вясёлых зімовых канікул і шчаслівага Новага года. Усяго ў святочнай акцыі «Нашы дзеці» прынялі ўдзел больш за 15 тысяч хлопчыкаў і дзяўчатак. На галоўную ёлку былі запрошаны дзеці-сіроты, кадэты, дзеці з сем'яў бежанцаў, пераможцы алімпіяд, творчых конкурсаў, спартыўных спаборніцтваў і іншыя.

Надзея АНІСОВІЧ.

Надвор'е

У навагоднюю ноч невялікі марозік і лёгкі сняжок

А ў першы дзень года чакаецца мокры снег, які па захадзе краіны будзе пераходзіць у дождж

У нашай краіне ў апошнія дні снежня будзе пераважаць воблачнае з ападкамі надвор'е з тэмпературным фонам на 3—5 градусаў вышэй кліматычнай нормы, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Сёння ўдзень надвор'е будуць вызначаць атмасферныя франты ад цыклону, які рухаецца праз тэрыторыю краіны. Чакаецца снег, мокры снег, па паўднёва-заходняй палове краіны з дажджом. У суботу ўначы месцамі, а ўдзень у многіх раёнах пройдзе снег, мокры снег, днём па захадзе з дажджом. У асобных раёнах слабы туман, на дарогах галалёдзіца. Уначы будзе ад мінус 1 да мінус 7 градусаў, па паўночным усходзе тэмпература панізіцца да 9 марозу, у паўднёва-заходніх раёнах будзе ад нуля да плюс 2 градусаў. Удзень чакаецца ад мінус 5 градусаў па паўднёвым усходзе да плюс 3 градусаў па захадзе краіны.

30 снежня будзе трымацца воблачнае надвор'е, часам снег, мокры снег, па паўднёвым захадзе краіны з дажджом. Месцамі чакаецца галалёд, слабы туман, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 градусаў да 2 цяпла, па паўднёвым усходзе апусціцца да 6 марозу. Удзень будзе ад мінус 2 градусаў па ўсходзе да плюс 4 градусаў па паўднёвым захадзе краіны. У панядзелак у нас захаваецца ўплыў атмасфернага фронту. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдзе кароткачасовы снег і мокры снег. На асобных участках дарог — галалёдзіца. Нават уначы будзе цёпла. Праўда, тэмпература будзе кантраснай: ад 6 марозу да 1 цяпла, удзень — ад мінус 4 да плюс 2 градусаў.

У навагоднюю ноч (1 студзеня) месцамі па краіне пройдзе кароткачасовы снег, тэмпература паветра ў асноўным складзе нуль — мінус 6 градусаў, па паўночным усходзе пры праясненнях яна панізіцца да 8 марозу. Удзень у аўторак тэрыторыя краіны апынецца пад уплывам чарговай сістэмы франтальных раздзелаў ад цыклону з цэнтрам над Фінляндыяй. Раніцай і ўдзень у многіх раёнах чакаецца снег, мокры снег, днём па захадзе краіны будзе пераходзіць у дождж. Тэмпература ўдзень складзе ад мінус 5 па ўсходзе да плюс 3 градусаў па захадзе краіны. Месцамі чакаецца галалёд, на дарогах галалёдзіца.

Сяргей КУРКАЧ.

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ!

Вы яшчэ паспяваеце падпісацца на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Нашы дзеці

ПАДАРУНКІ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ І НАВУЧАННЯ

Учора першы намеснік прэм'-ер-міністра Аляксандр ТУРЧЫН наведаў навагодняе свята ў дзіцячым доме сямейнага тыпу ў Лагойску, у якім выхоўваюцца дзесяць дзяцей. «У кожнага дзіцяці напярэдадні Новага года павінна быць адчуванне свята, і акцыя «Нашы дзеці» — магчымасць выканаць дзіцячыя мары», — такое меркаванне выказаў ён журналістам.

Госці пастараліся дагадзіць з падарункамі, і пра тое, што навагоднія жаданні здзейсніліся, казалі шчаслівыя твары і ўсмешкі. Дзяўчаткі атрымалі казачны домік, лялькі і тэлефоны, хлопцы — чыгунку, веласіпед і канструктар, паведамляе БелТА.

Аляксандр Турчын таксама павіншаваў дзяцей ад імя Савета па развіцці прадпрымальніцтва і адзначыў, што акцыю «Нашы дзеці» актыўна падтрымалі і беларускія бізнесмены.

«Мы ведалі, што хочуць рабяты, і пастараліся іх жаданні выканаць. Думаю, атрымалася. Такія мерапрыемствы даюць станоўчыя эмоцыі, ты можаш часцінку цеплыні і дабра падарыць малым», — дадаў ён.

Да гэтага Аляксандр Турчын наведаў школьныя навагоднія святы ў гарадскім пасёлку Балбасава пад Оршай. Разам з кіраўніцтвам Парка высокіх тэхналогій ён уручыў дзецям 600 планшэтаў.

Як паведамілі ў прэс-службе ПВТ, планшэты валодаюць тэхналогіяй камп'ютарнага зроку. Гэта рэвалюцыйная тэхналогія распрацавана спецыялістамі кампаніі Віктара Пракапені. Рэзідэнты ПВТ Facemetrics і Playgendary ўкараняюць унікальныя ва ўсім свеце інструменты для навучання: праграма кантралюе час працы на планшэце з дапамогай кам'ютарнага зроку. На прыкладзе ўсталявана спецыяльная праграма Nicola, якая сочыць за выкананнем хатніх заданняў. Спецыяльная камера аналізуе рухі вачэй карыстальніка, і калі малы захоча пагуляць у гульні на планшэце, то спачатку яму прыйдзецца выканаць хатняе заданне. Такім чынам кампаніі хочуць матываваць дзяцей да вывучэння розных прадметаў з маленства: ад чытання да матэматыкі. Плануецца супрацоўніцтва з вядучымі выдавецтвамі кніг. Праект разлічаны на дзяцей ва ўзросце ад шасці да дванаццаці гадоў.

— За гэты год, які прысвечаны малой радзіме, нямала зроблена ў развіцці кожнага рэгіёна, — адзначыў першы віцэ-прэм'ер. — IT-сфера і наш Парк высокіх тэхналогій, які рэгіструе рэзідэнтаў па ўсёй Беларусі, а значыць, IT-тэхналогіі ўпэўнена крочаць па ўсіх рэгіёнах краіны.

«У сваю чаргу кіраўніцтва Беларусі зробіць усё магчымае, каб па ўсёй краіне дзеці раслі і вучыліся ў роўных умовах», — дадаў Аляксандр Турчын.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Актуальна

«ЗАДАЧА ПРАФСАЮЗАЎ — ПА МАКСІМУМЕ ЗАКЛАСЦІ ГАРАНТЫІ ДЛЯ РАБОТНІКАЎ»

Асноўная роля прафсаюзаў заключаецца ў тым, каб дамагацца для работнікаў годнага заробку, стварэння бяспечных умоў іх працы і забеспячэння сацыяльных гарантый. Таму Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі зараз прапануе заканадаўча замацаваць норму, якая прадугледжвае ўдзел прадстаўніка прафкама не толькі пры прыняцці такіх знакавых для работніка рашэнняў, як, напрыклад, звальненне яго па ініцыятыве наймальніка, але таксама і пры заключэнні або прадаўжэнні кантракта. Аб гэтай і іншых ініцыятывах, а таксама аб асноўных выніках мінулага года мы пагаварылі са старшынёй Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму Таццянай ФІЛІМОНАВАЙ.

Пры прызначэнні надбаўкі прыслухаюцца да прафкама

— Гэты год быў адзначаны работай над новай рэдакцыяй Працоўнага кодэкса, — паведаміла Таццяна Філімонава. — Як уся Федэрацыя, так і наш галіновы прафсаюз сур'ёзна займаліся гэтым пытаннем. У цэлым па ініцыятыве прафсаюзаў у новую рэдакцыю Працоўнага кодэкса было ўнесена 40 артыкулаў.

Каб не быць галаслоўнай: у прыватнасці, прафсаюзы настаялі на захаванні тэрміну папярэджання работніка аб змяненні істотных умоў працы ў 30 дзён, хоць у першапачатковай рэдакцыі законапраекта стаяла скарачэнне гэтага тэрміну да сямі дзён. Гаворка ідзе пра тое, што пасля папярэджання аб змене істотных умоў працы (зарплаты, працягласці працоўнага дня і іншага) работнік павінен прыняць рашэнне: працягнуць працаваць на новых умовах альбо звольніцца. Больш працяглы перыяд папярэджання дае больш магчымасцяў для пошуку новай работы.

Немалаважным стала і ўключэнне ў дакумент палажэнняў, згодна з якімі заканадаўча будзе забяспечана магчымасць для прафкама прымаць удзел у абмеркаванні кантракта наймальніка з работнікам — сябрам прафсаюза. Справа ў тым, што ёсць тыпавая форма кантракта, але ў залежнасці ад стажу, вопыту, стаўлення наймальніка да работніка нормы, якія змяшчаюцца ў дагаворы, могуць адрознівацца. Часта бывае, што спецыялісты адной арганізацыі, прафесіі і кваліфікацыі з адным і тым жа стажам маюць розныя нормы, прапісаныя ў кантракце. Асабліва гэта датычыцца мер стымулюючага характару. Таму, каб у гэтым пытанні было больш справядлівасці, мы і настаялі на ўключэнні дадзенага пункта.

Сярод іншых прапаноў нацыянальнага прафцэнтра, якія ўвайшлі ў законапраект, таксама ёсць абмежаванне матэрыяльнай адказнасці работніка за шкоду, прычыненую наймальніку па яго віне (за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных артыкулам 404 Працоўнага кодэкса).

Кантракт на доўгі тэрмін — упэўненасць у заўтрашнім дні

Пытанне, якое хвалюе людзей і на якое звярталася сур'ёзная ўвага прафсаюзаў у гэтым годзе, — кароткатэрміновыя кантракты, гэта значыць тыя, якія заключаюцца на год. Прафсаюз работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму правёў маніторынг, і аказалася, што ёсць арганізацыі, дзе такія кантракты заключаюцца больш чым з 80 % работнікаў. Але калі ў чалавека няма ўпэўненасці ў заўтрашнім дні, у яго няма стымулу павышаць узровень свайго прафесіяналізму і больш якасна працаваць менавіта ў гэтай арганізацыі, лічыць Таццяна Філімонава.

Яна звяртае ўвагу на неабходнасць заканадаўчага замацавання такой нормы, як падаўжэнне або перазаключэнне кантракта з добрасумленнымі работнікамі на максімальна доўгі тэрмін (5 гадоў) альбо перавод іх на бестэрміновы працоўны дагавор з захаваннем усіх сацыяльных і матэрыяльных гарантый. Дадзеная норма існуе на сёння ў новым генеральным пагадненні на 2019—2021 гады, якое было падпісана 19 снежня 2018 года ў штаб-кватэры Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Яна ўжо ўключана і ў тарыфныя пагадненні з Міністэрствам культуры, Міністэрствам інфармацыі і Міністэрствам спорту, якія былі таксама падпісаны ў снежні гэтага года.

— Мы вельмі актыўна працавалі з дадзенымі ведамствамі па падрыхтоўцы пакетаў новых тарыфных пагадненняў. Скажу шчыра, праца была няпростай. Але нам удалося ўнесці 26 новых пунктаў, — заявіла старшыня галіновага прафсаюза.

Будзе ўзмоцнена абарона спецыялістаў перадпенсійнага ўзросту

Дададзены і такі пункт, як недапушчэнне звальнення па скарачэнні колькасці або штату работнікаў, якія маюць права застацца на працы ў адпаведнасці з дзейным заканадаўствам, а таксама асоб перадпенсійнага ўзросту — за тры гады да агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту.

— У працоўным заканадаўстве напісана — за два гады, але мы гэтую норму пашырылі, — тлумачыць Таццяна Філімонава. — Чаму мы звярнулі на яе асаблівую ўвагу? Як правіла, людзям у гэтым узросце вельмі цяжка працаўладкавацца. Вядома, няпроста ўладкавацца на работу і маладому спецыялісту, які не мае вопыту, але, зыходзячы з практыкі, я сказала б, што ў перадпенсійным узросце гэта яшчэ больш складаная задача. І хачу дадаць, што ў тарыфным пагадненні з Мінкультуры ў нас прапісаны яшчэ большы тэрмін — за пяць гадоў да дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту.

Сур'ёзным новаўвядзеннем у нашы тарыфныя пагадненні на 2019—2021 гады сталі пытанні, якія датычацца заахвочвання людзей, што вядуць актыўны здаровы лад жыцця (маецца на ўвазе адмова ад курэння, актыўныя заняткі фізкультурай і спортам і ўдзел у спартыўных мерапрыемствах, якія праводзяцца арганізацыяй). Мы рэкамендуем уключаць дадзеную норму і ў калектыўныя дагаворы.

Прафсаюз работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму штомесяц у апошнюю пятніцу праводзіць рэспубліканскую гарачую лінію. Патэлефанаваць можна па нумары (017) 203-89-52.

Прававой інспекцыяй працы Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму ў першым паўгоддзі 2018 года выяўлена 251 парушэнне, ліквідавана наймальнікамі 162 парушэнні.

Пытанне нумар адзін — зарплата бюджэтнікаў

Галіновы прафсаюз хвалюе і ўзровень заработнай платы работнікаў.

— У генеральным пагадненні ёсць норма, згодна з якой узровень заработнай платы ў бюджэтнай сферы павінен быць не ніжэйшы за 80 % сярэдняй зарплаты па краіне, — сцвярджае старшыня галіновага прафсаюза. — Але сёння мы бачым, што гэтая норма не выконваецца і разрыў з'яўляецца вельмі сур'ёзным, нягледзячы на тое, што ўрадам прымаюцца меры па яго скарачэнні. На жаль, гэтае пытанне стаіць перад намі ўжо не першы год і з'яўляецца нумарам адзін у нашым прафсаюзе. Што мы зрабілі для яго рашэння сёлета? У верасні, пасля таго як мы ўбачылі, што нават павышэнне зарплаты ў жніўні не палепшыла становішча, звярнуліся ў Савет Міністраў і дакладна апісалі ўзровень заробкаў работнікаў галін культуры і мастацтва, а таксама спорту і турызму. Па даручэнні Саўміна Міністэрства працы і сацыяльнай абароны падрыхтавала адказ, у якім было выкладзена, што плануецца зрабіць для павышэння заробкаў работнікаў гэтай галіны ў наступным годзе. Але наш прафсаюз гэтыя меры не задавальняюць: яны не даюць гарантыі сур'ёзнага павышэння заработнай платы работнікаў культуры і мастацтва. Таму мы плануем звярнуцца ў вышэйшыя інстанцыі і спадзяёмся, што нас там пачуюць.

— Надзённым з'яўляецца і наша імкненне выключыць выпадкі, калі работнікам робіцца даплата да мінімальнай заработнай платы, — кажа наша суразмоўніца. — На жаль, гэтая сітуацыя на сёння таксама існуе, у асноўным у арганізацыях фізічнай культуры і спорту. Так, даплата да «мінімалкі» праводзіцца многім трэнерам-выкладчыкам. І што вельмі сумна, такія даплаты ажыццяўляюцца з пазабюджэтных сродкаў, якія маглі б пайсці на стымуляванне працы работнікаў.

* * *

«У цэлым асноўная задача прафсаюзаў — па максімуме закласці гарантыі для работнікаў у тарыфныя пагадненні, бо яны з'яўляюцца асновай для далейшага заключэння калектыўных дагавораў, — сказала Таццяна Філімонава. — Па заканадаўстве, нормы калектыўных дагавораў не могуць быць ніжэйшымі за нормы, прадугледжаныя тарыфным пагадненнем. Хочацца адзначыць, што ў гэтым годзе мы стварылі галіновы Савет па працоўных і сацыяльных пытаннях, менавіта ён займаўся падрыхтоўкай новых тарыфных пагадненняў. Магчыма, у тым ліку і дзякуючы гэтаму нам удалося дамовіцца з міністэрствамі. Ну і хочацца выказаць шчырую падзяку нашым міністэрствам, якія нас пачулі і пайшлі насустрач пажаданням прафсаюза. Гэта паказчык стаўлення іх кіраўніцтва да людзей, якія працуюць у галіне».

Святлана БУСЬКО.

Ці чулі?

МІНСКАЯ ЁЛКА — АДНА З НАЙЛЕПШЫХ У ЕЎРОПЕ

Арыгінальная ёлка, якую сёлета ўстанавілі побач са сталічным Палацам спорту, прыйшлася даспадобы не толькі гараджанам. У спіс найпрыгажэйшых навагодніх дрэў Еўропы яе ўключыў тэлеканал Euronews.

Ёлка, што трапіла ў топ-ліст, складзена з кольцаў, пакрытых серабрыстымі гірляндамі і ліхтарыкамі. Разам з мінскай прыгажуняй адзначаны навагоднія дрэвы ў Берліне, Парыжы, Празе, Будапешце, Дортмундзе і іншых гарадах.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

ДА НОВАГА ГОДА ГАТОВЫЯ

Да галоўнага зімовага свята застаецца менш за тыдзень — вуліцы і плошчы Гомеля ўпрыгожаны ёлкамі, гірляндамі, сімваламі адыходзячага і надыходзячага гадоў, бліскучымі ў ночы актуальнымі фігурамі снегавікоў, знакаў задыяка, ёлачных цацак.

Не адстаюць ад абласнога цэнтра і сельскія жыхары. Так, калі вы выйдзеце на аўтобусным прыпынку «АЗС» у самым пачатку аграгарадка Яроміна (калі ехаць на гарадскіх аўтобусах № 43 або № 44 у бок Касцюкоўкі), пяройдзеце дарогу і пераадолееце метраў 100—150, то побач з адным з дамоў па вуліцы Савецкай (дарэчы, гомельская Савецкая вуліца плаўна перацякае ў сваё «яромінскае рэчышча») можаце ўбачыць двух досыць

«укормленых» парсючкоў. А побач з імі — сабачку. Не, ніхто іх на мароз не выгнаў — яны зроблены са снегу. Плюс (для мацнейшага каларыту) вушы і пятачкі свінак размаляваныя ружовай фарбай.

Калі я наведаў Яроміна, прайшоў моцны снег, і фігуры крыху страцілі сваю форму. Гаспадары якраз прыводзілі іх у парадак. Заадно паказалі мне яшчэ і снежнага парсючка ў сваім двары.

Увогуле, і ў Гомелі, і ў Яроміне да Новага года гатовыя на ўсе сто працэнтаў.

Максім ШАСТАКОЎ.

ПРАДСТАЎНІКІ ЎЛАДЫ ЗНОЎ АДКАЖУЦЬ НА ПЫТАННІ

Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 29 снежня ў Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах.

Тэлефонныя лініі з 9.00 да 12.00 у суботу правядуць:

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Вялічка Алег Іванавіч (8 016 221 31 21);

старшыня ВІЦЕБСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Цярэнцьеў Уладзімір Уладзіміравіч (8 021 222 22 22);

кіраўнік спраў ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Клічкоўская Алена Уладзіміраўна (8 023 233 12 37);

старшыня ГРОДЗЕНСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Жук Ігар Георгіевіч (8 015 273 56 44);

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Кунцэвіч Андрэй Міхайлавіч (8 022 250 18 69);

старшыня МІНСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Якубіцкая Наталля Віктараўна (8 017 500 41 60);

старшыня МІНСКАГА гарадскога Савета дэпутатаў Панасюк Васіль Васілевіч (8 017 222 44 44).

Падрабязнасці

СІТУАЦЫЯ ПАД КАНТРОЛЕМ

Зніжэнне колькасці злачынстваў у Мінску адзначаецца практычна па ўсіх асноўных напрамках прафілактычнай дзейнасці органаў унутраных спраў.

Як расказаў **начальнік упраўлення па ахове грамадскага парадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандр КУПЧЭНЯ**, крымінагенная абстаноўка па выніках снежня характарызуецца нязначным ростам крымінальна каральных дзеянняў. Гэты рост адбыўся ў першую чаргу за кошт выяўлення злачынстваў. Узрасла колькасць зарэгістраваных махлярстваў, злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій, атрымання хабараў, а таксама ўстаноўлена больш фактаў незаконнага абароту наркатычных сродкаў.

Разам з тым колькасць злачынстваў, здзейсненых у грамадскіх месцах, зменшылася на 1,4 % (у параўнанні са студзенем — ліставпадам 2017 года, з 5040 да 4971). А колькасць правапарушэнняў, учыненых у стане алкагольнага ап'янення, знізілася на 9,2 % (з 2430 да 2206). Пайшла на спад таксама колькасць злачынстваў, здзейсненых непаўналетнімі, — на 29,4 % (з 306 да 216) і замежнымі грамадзянамі, — на 5,5 % (з 326 да 308).

Адным з асноўных фактараў, якія негатыўна ўплываюць на абстаноўку ў горадзе, па-ранейшаму застаецца п'янства. Асноўныя намаганні міліцыі накіраваны на выяўленне фактаў распівання ў грамадскіх месцах алкагольных напояў і недапушчэнне знаходжання на вуліцах грамадзян у стане моцнага ап'янення. Вынікам гэтай працы стала павелічэнне колькасці асоб, прыцягнутых да адміністрацыйнай адказнасці. Тых, хто не жадае стаць на шлях выпраўлення, накіроўваюць у лячэбна-працоўныя прафілакторыі. Так, за мінулы год у ЛПП адпраўлена 1348 чалавек.

Актыўна ідзе барацьба з гвалтам у сям'і. Агульная колькасць зарэгістраваных злачынстваў у сферы сямейна-бытавых адносін знізілася на 30,3 % у параўнанні з такім жа перыядам летась. Адным з эфектыўных рычагоў супрацьдзеяння сямейнаму гвалту з'яўляецца прыняцце мер прэвентыўнага ўздзеяння да асоб, якія яго ўчыняюць. Гэта прыцягненне іх як да адміністрацыйнай, так і да крымінальнай адказнасці — за катаванне або пагрозу забойствам.

— Сітуацыя, якая складваецца ў сталіцы, у цэлым падкантрольная органам унутраных спраў, — адзначыў Аляксандр Купчэня. — Тыя задачы, якія стаяць перад намі, выконваюцца па ўсіх напрамках. У наступным годзе наша праца будзе ўзмоцнена, тым больш што нас чакае такі сур'ёзны экзамен, як Еўрапейскія гульні.

Сяргей КУЛАКОЎ.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец) в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснева Н. М. извещает о проведении 14 января 2019 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 10 % в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Шаг аукциона – 5 %, бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
	Примечание (лот №№ 1–2): Земельный участок под объект продажи будет выделен по заявке нового собственника согласно законодательству РБ (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается). **Информация о земельном участке (лот №№ 1–2):** кадастровый номер **320850100004000077** общей площадью **4,9542 га (право постоянного пользования).** **Местонахождение:** Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, д. 46. **Целевое назначение земельного участка:** земельный участок для содержания обслуживания производственной базы			
1	**Капитальное строение с инв. № 311/С-28065** общей площадью **369,1 кв. м,** назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – **столярный цех. Капитальное строение с инв. № 311/С-28066** общей площадью **590,3 кв. м,** назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – **пилорама. Капитальное строение с инв. №311/С-28427** общей площадью **103,9 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **склад. Благоустройство внутридворовое** (инв. № 1-355): асфальтобетонное покрытие **(площадка 1б)** – общей площадью **5 040,0 кв. м Забор кирпичный** (инв. № 1-794а). **Забор металлический** (инв. № 1-794в). **Электроснабжение** (инв. № 1-730): АВВГ 4х50 **– 30,0 м**	**185 202,72**	9 260,14	18 520,27
2	**Капитальное строение с инв. № 311/С-28433** общей площадью **459,5 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **административное здание. Капитальное строение с инв. № 311/С-28063** общей площадью **12,6 кв. м,** назначение – проходная, наименование – **здание проходной. Погреб** (возле административного здания) (инв. № 1-795). **Благоустройство внутридворовое** (инв. № 1-355): асфальтобетонное покрытие **(площадка 1а)** – общей площадью **3 360,0 кв. м.** Благоустройство внутридворовое (инв. № 1-366) (тротуарная плитка – длина 64,0 м, ширина – 2,4 м). Ворота центральные (инв. № 1-793). **Забор железобетонный** (инв. № 1-7946). **Электроснабжение** (инв. № 1-730): АВВГ 3х35+1х10 **– 60,0 м**	**221 546,88**	11 077,34	22 154,69

Продавец: ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука,12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044) 769-19-61, 8 (0232) 53-27-62 – по недвижимости Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 28 декабря 2018 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 10 января 2019 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. **Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 5 (пять) дней до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» ст. 127–129. **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 23.10.2018 г. № 204 (28820). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Трамп: ЗША больш не могуць быць сусветным жандарам



Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп заявіў падчас візіту ў Ірак, што Злучаныя Штаты не могуць заставацца сусветным жандарам.

«Несправядліва, калі ўся ноша ляжыць на нас, на Злучаных Штатах, — заявіў кіраўнік Белага дома. — Мы разгрупаваны па ўсім свеце. Мы знаходзімся ў краінах, пра якія большасць людзей нават і не чулі. Па праўдзе кажучы, недарэчна».

Прэзідэнт разам з першай лэдзі ў сераду наведаў з неабвешчаным візітам размешчаную на захад ад Багдада ваенна-паветраную базу Айн аль-Асад і паразмаўляў з амерыканскімі ваеннымі. Трамп таксама сустрэўся з паслом ЗША ў Іраку і камандным складам.

На зваротным шляху прэзідэнт ЗША наведаў авіябазу Рамштайн у Германіі, паведаміла агенцтва Associated Press. Авіябаза Рамштайн з'яўляецца найбуйнейшым апорным пунктам ВПС ЗША на тэрыторыі Германіі і за межамі ЗША.

Амаль тры мільёны расіян аказаліся невыязнымі перад Новым годам

Амаль тры мільёны расіян апынуліся ў 2018 годзе ў ліку невыязных даўжнікоў перад навагоднімі святамі. Пра гэта ТАСС паведамілі ў Федэральнай службе судовых прыставаў.

Больш за ўсё грамадзян краіны трапіла ў лік невыязных даўжнікоў з-за крэдытаў.

«Па стане на 1 снежня дзейнічала каля трох мільёнаў пастаноў аб часовым абмежаванні на выезд даўжнікоў з Расійскай Федэрацыі», — сказалі ў ФССП.

Год таму пад абмежаваннем выезду знаходзілася на адзін мільён чалавек менш — 1,7 мільёна даўжнікоў.

У Сатурна знікаюць кольцы

Паводле даследавання Джэймса О'Донах'ю, кольцы Сатурна, якія складаюцца больш чым на 90 % з ледзяной вады, паступова прыцягваюцца да планеты. Пра гэта са спасылкай на The New York Times піша TJournal.

Даследчыкі лічаць, што пад уздзеяннем магнітнага поля да газавага гіганта прыцягваецца дзве тоны вады ў секунду. Максімальны «жыццёвы цыкл» кольцаў абмежаваны 292 мільёнамі гадоў — і цяпер яны «пражылі» палову гэтага тэрміну.



У 1980-х гадах вучоныя ўпершыню выказалі здагадку, што кольцы прыцягваюцца да Сатурна, аднак доказы былі атрыманыя толькі ў 2013 годзе. Да гэтага часу даследчыкі лічылі, што кольцам прыкладна некалькі мільярдаў гадоў — як і самой планеце.

Па новай інфармацыі, ім можа быць «усяго» 100 мільёнаў гадоў. Як заўважыў О'Донах'ю, гэта значыць, што чалавецтва магло прапусціць момант, калі такія ж буйныя кольцы былі ў іншых газавых гігантаў.

ХТО ШУКАЕ — ТОЙ НЕ БЛУДЗІЦЬ?

Што знаходзяць беларусы на шопінгу ва Украіне

У суседа трава заўсёды зелянейшая. «А яшчэ ежа смачнейшая, і шмат што таннейшае», — скажуць вам у цягніку, які ідзе з Баранавічаў да Удрыцка (Ровенская вобласць Украіны). Карэспандэнт «Звязды» даведалася, праз што даводзіцца прайсці ахвотнікам закупіцца ў найбліжэйшых суседзяў.

Усе бягуць — і ты бяжы

«На закупы» ў вёску Удрыцк мяне даўно клікала сваячка, якая жыве ў Лунінецкім раёне. Раз-два ў сезон яна разам з сяброўкамі наведваецца ў прыгранічча па тавары для дому і прадукты. Бывае, бярэ нешта з адзення і цацкі для ўнука. У абавязковае «замежнае» падарожжа жанчына адпраўляецца і перад кожным святам.

— Тут галоўнае — не лічыць варон і дакладна ведаць, што табе трэба. Інакш толькі дзень упустую патраціш і грошы на абы-што разыдуцца, — кансультуе мяне сваячка перад паездкай. — Амаль усе, хто будзе ў цягніку, — таксама «на закупы». Таму куды натоўп — туды і ты.

Сонечнай снежанскай нядзелькай я сядаю ў дызель-цягнік у Лунінцы. Амаль усе месцы ўжо занятыя: шмат людзей едзе на Удрыцк з Баранавічаў, Ляхавічаў, Ганцавічаў.

Праз гадзіну мы прыбываем на станцыю Гарынь. Выйшаўшы з вагона, я тут жа трапляю ў людскую плынь. Куды рухаемся — невядома. Але ніякай панікі, бо памятаю запавет цёткі: «Усе бягуць — і ты бяжы». Фініш пяціхвілінай дыстанцыі — пункт мытнага кантролю. Тут ужо стаіць чалавек сто, нам нічога не застаецца, як далучыцца да іх. Амаль ва ўсіх у руках — дарожныя сумкі ці «пакеты з пакетамі». Кожныя дзесяць хвілін людзей становіцца ўсё больш...

На ўзгорку за карцінай назірае каларытная правадніца ў акулярах. У чаканні пасажыраў дызеля, які пойдзе назад на Баранавічы, яна лускае гарбузікі і спрабуе наставіць на розум людзей:

— Што вы тут стаіце? Раней, чым праз гадзіну прапускаць не пачнуць! А цягнік увогуле адпраўляецца толькі ў 14.00. Да таго ж ва ўкраінскіх дызелях ацяплення няма. Будзеце ўсю дарогу да Удрыцка зубамі ляскаць. Ідзіце пагрэйцеся ў вагончыку каля прыбіральні. Ён зараз замест залы чакання, — гучна заклікае жанчына, а пасля ў паўголаса тлумачыць мне: — Вакзал другую зіму на рамонце. Але нават калі б быў адчынены, гэтыя фанаты шопінгу па-ўкраінску ўсё адно не пайшлі б унутр.

І сапраўды, як ні старалася правадніца пераканаць народ, што лепш пасядзець у цяпле, чым таптацца па слоце, ніхто яе парады не слухаў.

Калі я ўжо была на самым падыходзе да мытні, літаральна з ніадкуль побач узніклі дзве жанчыны з некалькімі забітымі пад завязку сумкамі.

— Табе п'яць, мне п'яць і Васе п'яць. І людзям надо распіхаць, бо накрыюць нас, — хутка тараторыць адна другой.

Што было ў сумках, я так і не разглядзела. Але пасля заўважыла, што многія ўкраінцы цэлымі скрынямі вязуць з Беларусі сухое дзіцячае харчаванне і згушчанае малако. І тое, і другое бяруць не самае таннае. Толькі пэўных марак і з добрым працэнтам тлушчу.

Прайшоўшы кантроль, адразу трапляем на платформу. Старэнькі ўкраінскі дызялёк з іржавымі вагонамі быццам прыехаў у Гарынь з 90-х. Антуражу яму дадаюць немаладыя жанчыны ў норкавых шапках і з масіўнымі залатымі завушніцамі. Як высветлілася, гэта мясцовая «мафія» — у кожнай у руках было па пачку ўкраінскіх грывень. Іх яны абменьваюць на беларускія рублі проста ў тамбуры.

Цягнік хутка запаўняецца людзьмі, многія застаюцца ў тамбуры. І правільна робяць. Дарога займае ўсяго 15 хвілін. Ва Удрыцку чакае новае выпрабаванне — яшчэ адна чарга, але ўжо на мытным кантролі Украіны. Вялікая колькасць людзей з цяжкасцю ўмяшчаецца на вузенькай платформе. З аднаго боку натоўп стрымлівае высокі плот з пікамі, з другога — жанчына-пагранічніца з аўтаматам. У жудаснай цісканіне, на холадзе мы стаім паўтары гадзіны. Пэўна, збоку падобныя на статак бараноў, якія добраахвотна пагадзіліся на гэты цырк.

«А гузікі самі прышыеце...»

Удрыцк — вёска зусім невялікая. Будынак станцыі выглядае як традыцыйная «хатка-мазанка». Улетку беларускія пакупнікі падымаюць пыл на дарогах, а ўвосень і зімой абыходзяць вялізныя лужыны — асфальту няма. Мясцовы базар знаходзіцца за два крокі ад чыгункі. Ды і колькі там таго базару? З дзясятак палаток і драўляных столікаў, якія стаяць уздоўж адзінай вуліцы, плюс тры крамы. Ёсць яшчэ пара прадаўцоў, якія разгарнулі свой тавар проста на капотах старэнькіх «Жыгулёў».

Найперш адпраўляюся ў самую вялікую краму. Тут на суседніх палічках ляжаць коўдры і цацкі, галёшы і лазневыя халаты, жырандолі і сталовыя прыборы. Цэны не сказаць, каб дужа адрозніваліся ад беларускіх, але народ змятае ўсё, што бачыць.

У гэтым жа будынку знаходзіцца вінна-гарэлачны павільён. Не прапіхнуцца. Мужыкі абступілі прылавак, за якім пабліскваюць бурштынавымі адценнямі бутэлькі каньяку, моладзь і жанчыны прыцэньваюцца да мясцовага віна, «беленькую» хапаюць усе без разбору. Цэны на гарэлку стартуюць ад 2,5 беларускага рубля. Праўда, ахвотнікаў пакаштаваць гэты напой у натоўпе няма. Бяруць у асноўным тую, што каштуе тры-чатыры рублі. Прычым адной пляшкай тут ніхто не абмяжоўваецца. Не шкадуючы грошай, просяць у прадаўшчыц мінімум тры, часта — пяць і нават дзесяць.

А вось у краме, якая нагадвае сельскія ўнівермагі, амаль нікога няма. Якасны трыкатаж і баваўняная бялізна ўкраінскіх фабрык нашых людзей не цікавяць. Хоць цэны прыемныя і дызайн неблагі.

На вуліцы гандаль ідзе таксама не ва ўсіх. Прадаўцы цукерак пазяхаюць ад нуды: у іх бок беларускі пакупнік нават не глядзіць.

— Цукеркі тут я даўно не бяру. Гэта раней і выбар быў большы, і цэны меншыя. Цяпер цэны на шакаладныя ласункі параўняліся з айчыннымі. Акрамя таго, у нашы крамы пачалі завозіць недарагія цукеркі расійскіх кандытарскіх фабрык, лепш іх узяць, — падзялілася жанчына, якую ўдалося спыніць на вуліцы. — А вось хлеб тутэйшы купляю заўсёды, хоць і каштуе, як наш. У іх склад больш натуральны — толькі мука, вада, дрожджы ды соль.

Эпізод з разраду «і смех, і грэх» давялося назіраць каля прадаўца камізэлек са штучнага футра. Дзяўчына-студэнтка сабралася набываць адну, але заўважыла, што на ёй няма гузікаў.

— Коштуе вона 140 грывень, поступлю 10, — сказаў пакупніцы прадавец.

— Але ж мне прыйдзецца самой гэтыя гузікі і купіць, і прышыць.

— Зрозумій, якшчо поступлю больш — піду ў мінус. І так по собівартосці аддаю, — працягваў гнуць сваю лінію мужчына, але неўзабаве здаўся. — Хвіліну!

Схапіў нажніцы, зрэзаў чатыры гузікі з іншай камізэлькі і высыпаў іх у далонь дзяўчыне. Вось гэта сэрвіс!

Прыкладна за гадзіну да адпраўлення народ пачынае падцягвацца да мытнага паста. У кожнага па дзве, а то і па тры сумкі накупленага. Многія валакуць іх па зямлі — не падняць.

Побач у чарзе на праходжанне кантролю прыстроілася пара. Муж і жонка акуратненька хаваюць пад курткі па некалькі бутэлек спіртнога.

— Дазволена правозіць тры літры на душу, мы ў ліміт ніколі не ўкладваемся, — тлумачыць мужчына, усміхаючыся ў пышныя вусы.

Пакуль мы размаўляем, употай пазіраю да іх у сумкі: некалькі пакетаў з печывам, покрыўкі і абрусы, цацкі, фен і плойка. Пад рукой мужчына трымае сушылку для бялізны. Увогуле, кожны другі з Удрыцка чамусьці вёз ці сушылку, ці дошку для прасавання. Пыталася пра цэны — такія ж, як у нас. У чым сакрэт прыцягальнасці гэтых рэчаў для нашых людзей, я, прызнацца, так і не зразумела.

Сыр-касічка, шакаладкі, «Ё-маё»

Дарога з Удрыцка дадому таксама тоіць у сабе масу сюрпрызаў. Пагрузіўшыся ў цёпленькі і чысты цягнік з роднымі літарамі «БЧ» на вагонах, людзі не ўздыхаюць з палёгкай і не адкідваюцца на спінкі сядзенняў. Наадварот, пачынаецца незвычайнае ажыўленне. Шапацяць пакеты, і чуюцца гукі расшпільвання замкоў на сумках. Тут і там народ перапакоўвае набытае дабро.

Мая спадарожніца, што сядзіць насупраць, таксама выварочвае на сядзенне рэчы са сваіх сумак. Вялізныя пачкі сурвэтак, пакеты з зефірам і печывам, не менш за два кіло кількі, дзясяткі катушак нітак, пяць пачак вафельных карзінак для канапэ, партатыўная калонка... Дзіўны набор, увенчаны сушылкай для бялізны.

— Куды едзеце? — нечакана над намі паўстае жанчына ў ружовым пухавіку з чорным пакетам у руках. — Лунінец? Вазьміце, калі ласка, мае арэхі сабе. А то ў мяне пераважка па кілаграмах — на мытні могуць забраць.

За правоз дамачка прапаноўвае два рублі. Аказалася, што з Удрыцка яна вязе з сабой цэлы мех грэцкіх арэхаў, якія дома збіраецца прадаваць. Праўда, мяжу тавар перасякае ў расфасаваным выглядзе пад рознымі сядзеннямі вагона.

— Сыр-касічка, шакаладкі, «Ё-маё», — выкрыквае іншая жанчына назвы тавараў, якія пачынае прадаваць проста ў дарозе. Многія пакідаюць ёй апошнія дзясяткі грывень. «Чаго дамоў везці? Лепш яшчэ адну шакаладку дзецям вазьму», — разважаюць пасажыры.

* * *

Іронія лёсу: вярнуўшыся на вакзал у Лунінец, я ўбачыла па тэлевізары сюжэт з адкрыцця новай крамы ў горадзе. За апошнія некалькі гадоў тут з'явілася некалькі вялікіх супермаркетаў, а маленькія сеткавыя гастраномы працуюць нават у вёсках. І гэта не кажучы пра магазіны мясцовага спажывецкага таварыства, якія таксама ідуць у нагу з часам: пастаянна ладзяць акцыі і даюць зніжкі, нядаўна ўвялі ва ўжытак дысконтныя карты для пакупнікоў. Здаецца, купляй не хачу! Але ж, вядома, суседская трава зелянейшая...

Ганна КУРАК.

Мінск — Удрыцк — Мінск.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 24-63-14

Продавец: Открытое акционерное общество «Завод «ЭВИСТОР» 210101, г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81 тел. (0212)55-11-81

Лот № 1. Изолированное помещение с инв. № 200/D-184038 площадью – 556,7 кв. м, назначение – производственное помещение, наименование – производственное помещение, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/20-19. **Нач. цена:** 40 977,63 бел. руб. (без НДС). **Задаток**: 4 097,76 бел. руб.
Лот № 2. Капитальное строение с инв. № 200/С-73289 площадью – 1295,4 кв. м, наименование – здание автоматизированной компрессорной, назначение – здание специализированное энергетики, по адресу: Витебская обл, г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/25. **Нач. цена:** 65 439,80 бел. руб.(без НДС). **Задаток**: 6 543,98 бел. руб.
Лот № 3. Изолированное помещение с инв. № 200/D-166435 площадью – 381,9 кв. м, назначение – административное помещение, наименование – административное, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/1-6. **Нач.цена:** 49 474,99 бел. руб. (без НДС). **Задаток**: 4 947, 50 бел. руб.

Дата, время и место проведения аукциона: 28.01.2019 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатков и приема документов:** с 28.12.2018 с 8.30 по 25.01.2019 до 17.30. Срок подписания договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона, оплата за объект производится в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. Условие аукциона: возмещение затрат по подготовке документации, оплата НДС сверх цены продажи объекта. Изолированные помещения и капитальное строение расположены на земельном участке с кадастровым номером 240100000001002628 (общая долевая аренда)

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по подготовке документации на р/с, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. **Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566.** Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Доп. информацию можно получить по тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

Дзед Мароз — герой

У добрым настроі Марыя звала свайго мужа Паўлам, Паўлікам, у дрэнным — выключна па прозвішчы — Марозаў. Праўда, было гэта вельмі рэдка...

Дык вось неяк пад Новы год Паўлу не пашчасціла: майстар змены папярэдзіў, што яму прыйдзецца падзяжурыць і якраз у навагоднюю ноч.

Жонка, вядома ж, засмуцілася, але што тут будзеш рабіць: сабрала яму тое-сёе на перакус і, каб не было спакусы чарку кульнуць, паклала з сабой пакет малака.

А трэба сказаць, што зіма той год была вельмі лютая. Маразы пачаліся яшчэ ў пачатку снежня, а пад Новы год ртутны слупок і наогул «завіс» на мінус 25. Факт, што Павел, чакаючы аўтобус, ажно сцяўся ад холаду, адзіноты і крыўды: свята ж на дварэ, людзі сядзяць сабе дома, туды, дзе цёпла і смачна, спяшаюцца рэдкія прахожыя, а ён...

Шафёр аўтобуса таксама, відаць, спяшаўся, бо спыніўся аж за прыпынкам. Павел памкнуўся падбегчы за ім і ледзь не паваліўся — правая нага не гнулася. Ён схапіўся за калена рукой і адчуў пад ёю нешта калянае. Скінуў рукавіцу, яшчэ раз абмацаў нагу і ў святле, якое праменілася з аўтобуса, убачыў, што правая калашына стала белай і ледзяной. «Малако!» — мільганула думка. І сапраўды — у сумцы ад яго застаўся толькі пакет.

Ехаць на работу ў мерзлых портках Паўлу не выпадала: неяк дакульгаў дадому. Жонка, убачыўшы яго на парозе, сказала:

— Ну ты даеш, Марозаў! Няўжо не адчуваў, што замярзаеш?!

— Адчуваў... не адчуваў, — злаваўся Павел, — давай сухую адзежу, а то на апошні аўтобус спазнюся...

Тым часам у прыадчыненыя дзверы дзіцячага пакоя прасунуліся дзве бялявыя галоўкі дачок.

— Гэта Дзед Мароз прыходзіў, — шаптала адна. — Я чула, мама яго так назвала.

— Ён, відаць, падарункі прынёс? Але ж чаму так хуценька збег?

— Баяўся растаць... Бачыш — белыя плямы на падлозе.

— Дык ён малочны? З марозіва?

...Раніцай, калі гаспадар вярнуўся з дзяжурства, дочкі наперабой расказвалі яму, што ноччу прыходзіў Дзед Мароз, што ён прынёс падарункі, але сам ледзь не растаў.

Ала Клемянок,

г. Смаргонь.

З людзьмі і да людзей

...Мая сталая педагагічная дзейнасць пачалася ў новай школе, у дружным калектыве настаўнікаў і вучняў.

Але ж вось куляй праляцела першае паўгоддзе, адзнакі выстаўлены, навагоднія мерапрыемствы і бацькоўскія сходы праведзены — можна адпачываць. У тыя застойныя, але вельмі светлыя гады ад настаўнікаў не патрабавалі яшчэ ўсе канікулы праводзіць у школе. Было адно абавязковае дзяжурства, а што далей рабіць — кожны вырашаў сам.

Мне ў той год пашанцавала. Дырэктар школы клапатліва спыталася: «Ты ж не замужам?.. Значыць так: сустракай Новы год з добрымі людзьмі... Дасць бог, і мужа сустрэнеш». Сказала — як у ваду паглядзела. Але ж па парадку.

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан). **Для участия в аукционе** граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся: внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; в двухмесячный срок со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся обратиться в соответствующую территориальную организацию по гос. регистрации за гос. регистрацией прав на зем. участок; получить в установленном порядке разрешение райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; в течение 1 года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем. участка в соответствии с целью и условиями его предоставления; осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно ПСД. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт. тел.: (0212) 24-63-14, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении публичных торгов в форме аукциона по продаже имущества ОАО «Барановичский завод санэлектрозаготовок»

Дата и время проведения: 15.01.2019 в 11.00.
Прием заявлений участников на участие в торгах будет осуществляться с 09.00 28.12.2018 до 09.00 15.01.2019.

№ лота	Наименование	Инв. №	Год выпуска	Начальная цена	Шаг аукциона	Размер задатка
1	Изолированные помещения неустановленного назначения (битумноперлитный цех), общ. площ. 2294,4 кв. м	№ 110/D-2776433	1975	120 600,00	6 030,00	6 030,00
2	Капитальное строение – пожарный водоем площ. 312 кв. м	110/С		13 260,00	663,00	663,00
3	Капитальное строение Столовая и цех низковольтной аппаратуры площ. 6504 кв. м. Зем. уч. №141000000003000649	110/ С86817	1969	644 760,00	32 238,00	32 238,00
3	Грузовой седельный тягач МАЗ 6422А8	9511-1	2009	9000,00	450,00	450,00
2	Фальцепрокатный механизм ОКС-8906	4501	1980	162,00	8,10	8,10
3	Фальцеосадочный механизм СТД-25	4336	1970	288,00	14,40	14,40
4	Фальцепрокатный механизм СТД-16А	4350	1979	162,00	8,10	8,10
6	Пневмолистогиб	4989	1990	252,00	12,60	12,60
9	Фальцеосадочный механизм 5Н-475	4842	-	216,00	10,80	10,80
10	Фальцеосадочный механизм СТД-25	4332	1970	531,00	26,55	26,55
11	Зигмашина ИБ-2713	4322	1965	171,00	8,55	8,55
18	Зигмашина ВМС-76В	4809	1984	90,00	4,50	4,50
19	Зигмашина ВМС-76В	4925	1990	140,00	7,00	7,00
20	Зигмашина ВМС-76	4320	1976	140,00	7,00	7,00
21	Зигмашина ИБ-2713	4337	1965	170,00	8,50	8,50
22	Зигмашина ВМС-76В	4844	1988	140,00	7,00	7,00
24	Фальцепрокатный механизм СТД-16А	4352	1980	162,00	8,10	8,10
27	Лебедка стационарная	8139	1988	216,00	10,80	10,80
34	Координатно-расточной ст. 2В440А	4451	1973	450,00	22,50	22,50
37	Универсально-заточной ст-к 3В642	4471	1988	126,00	6,30	6,30
42	Резьбонарезной механизм ВМС-2А	4997	1990	102,60	5,13	5,13
43	Печь электрическая СНЗ-4	5090	1970	270,00	13,50	13,50
45	Пылеотсос ЗИЛ900	45991	1984	100,00	5,00	5,00
53	Резьбонарезной механизм ВМС2А	4980	1979	102,60	5,13	5,13
60	Трубогиб СТД-439	4199	1979	300,00	15,00	15,00
61	Трубогиб ОКС-8943	4271	1982	250,00	12,50	12,50
62	Резьбонарезной механизм ВМС-2А	4840	1987	102,60	5,13	5,13
67	Пресс механический К-2124	4315	1967	378,00	18,90	18,90
68	Пресс механический КД-2124Е	8142	1983	378,00	18,90	18,90
74	Листогиб СТД-9А	4329	2002	1100,00	55,00	55,00
84	Станок круглопильный Ц6-2	4010	1979	268,20	13,41	13,41
86	Обдирочно-заточной ст-к с обор. лист.	4026	1980	162,00	8,10	8,10
89	Трубогиб	4221	1979	162,00	8,10	8,10
90	Труборез 5Н-428	4227	1979	176,40	8,82	8,82
91	Резьбонарезной механизм ВМС-2А	4234	1973	102,60	5,13	5,13
92	Вертикально-сверл. ст-к 2Н-135	4244	1970	216,00	10,80	10,80
97	Резьбонарезной механизм ВМС-2АВ	4920	1990	102,60	5,13	5,13
99	Резьбонарезной механизм ВМС-2А	4240	1979	102,60	5,13	5,13
101	Резьбонарезной механизм ВМС-2А	4550	1972	102,60	5,13	5,13
105	Зигмашина СТД-865	4801	1983	140,40	7,02	7,02
108	Пресс КД-2326	4314	1996	621,00	31,05	31,05
110	Фальцеосадочный мех-м СТД-25	4324	1966	288,00	14,40	14,40
111	Зигмашина ВМС-76В	4344	1980	140,40	7,02	7,02
120	Пресс механический КТП К-242А	8128	1980	288,00	14,40	14,40
126	Вертикально-сверлильный станок	4531	1972	100,00	5,00	5,00
128	Пресс механический КД-2124К2.1Т	4950	1991	378,00	18,90	18,90
131	Обдирочный станок ЗК633	4908		162,00	8,10	8,10
141	Свароч. трансформ. ВДТ 506	5448	1989	250,00	12,50	12,50
117	Установка для гибки полосы	8144	1992	100,00	5,00	5,00
146	Механизм для сборки конвекторов	4834	1986	270,00	13,50	13,50
116	Установка для вулканита	4938	1979	50,00	2,50	2,50
147	Механизм резьбонарезной	4189	1983	102,60	5,13	5,13

1. Продавец и организатор торгов: ОАО «Барановичский завод санэлектрозаготовок» тел.: +375163414964, +375291070012.
2. Место проведения: г. Барановичи, ул. Пролетарская, 46, здание администрации.
3. Место нахождения предмета торгов: г. Барановичи, ул. Пролетарская, 46.
4. Лицо, желающее участвовать в торгах, обязано подать организатору торгов в указанный в извещении срок заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет предприятия, с отметкой банка, копии устава и свидетельства о государственной регистрации. Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение десяти рабочих дней со дня их проведения. При подаче документов на участие в торгах физическое лицо, индивидуальный предприниматель, представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица, иной организации предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его копию, которая заверяется организатором торгов.
5. Ознакомиться с предметами торгов можно по месту нахождения, предварительно согласовав дату и время с представителем продавца по тел. +375298091058.
6. По результатам торгов организатором торгов составляется протокол, подписываемый всеми участниками аукциона.
7. С победителем торгов продавцом в срок не позднее 25 рабочих дней от даты подписания протокола о результатах торгов заключается договор купли-продажи. Приобретенный предмет торгов оплачивается участником, выигравшим торги не позднее 3 рабочих дней от даты заключения договора купли-продажи.
8. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником, либо для участия в них явился только один участник, предмет торгов может быть продан этому участнику по цене, превышающей начальную, на 5 %.

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. Каб годна сустрэць Новы год, давядзецца шмат працаваць, затое з'явіцца магчымасць праявіць усе найлепшыя якасці: розум, упартасць, уседлівасць і выдатныя арганізатарскія здольнасці. Бліжэй да выхадных давядзецца сустракацца з капрызнымі партнёрамі або сябрамі. Зоркі раяць пазбягаць мітусні, агрэсіўнасці і самаўпэўненасці, як ва ўласных дзеяннях, так і з боку навакольных.

ЦЯЛЕЦ. Стары год быў добры, але ён эмацыянальна выматаў вас, таму Новы год лепш сустрэць у камфортнай, камернай абстаноўцы з прыемнымі для вас людзьмі. Работа паспрабуе заняць досыць шмат часу, але па значнасці яна лідзіраваць не будзе. Энергічнасцю і актыўнасцю зможаце ўмацаваць свае пазіцыі.

БЛІЗНЯТЫ. На гэтым тыдні вы здольныя вырашыць тыя задачы, якія для іншых здаюцца звышскладанымі. Паспрабуйце распланаваць тыдзень з улікам асабістага жыцця. Тым больш што ў вас пачынаецца паласа шанцавання. Падобна на тое, што ў разгары гарачы раман. І ваш партнёр будзе радаваць і натхняць. Чакайце ад яго прыемнага падарунка да свята. Уласцівыя вам упартасць, крэатыўнасць і працавітасць прынясуць вельмі адчувальныя вынікі.

РАК. Сустракайце святы са спакойнай душой. У выхадныя адпачывайце, забаўляйцеся, бо гэта ў вас выдатна атрымаецца. У другой палове тыдня можаце сутыкнуцца з рознага роду бюракратычнымі праблемамі, аднак здолееце іх хутка вырашыць. У суботу лепш прамаўчаць, гэта пазбавіць вас ад сварак і спрэчак.

ЛЕЎ. У панядзелак не варта занадта азартна купляць падарункі сабе і блізкім, можна набыць шмат непатрэбнага. У сярэдзіне тыдня ёсць верагоднасць, што вашы планы ўвойдуць у супярэчнасць з планамі начальства. Калі ў вас няма сіл абурацца, то лепш памяняць начальніка і работу разам. Успомніце прымаўку «Цікаўнасць загубіла кошку» і паспрабуйце не ўмешвацца ў чужыя справы.

ДЗЕВА. Адпачывайце, пакуль ёсць магчымасць. Такой магчымасці няма? Тады майце на ўвазе, што ў тых, каму давядзецца працаваць, будзе кульгаць дысцыпліна. Вам вельмі цяжка будзе засяродзіцца на бягучых справах, а ўжо пра новыя праекты і казаць няма чаго. Не варта зараз зацыклівацца і на сямейных праблемах, спроба высвятлення адносін не толькі не праясніць сітуацыю, але і гарантуе скандал. Навошта ён вам у разгар свят?

ШАЛІ. Надыходзячы тыдзень будзе напоўнены святочнай мітуснёй. Вы можаце занадта захапіцца пабудовай стратэгічных планаў, лепш заняцца рашэннем надзённых праблем. Серада і чацвер — не лепшы час, каб спрабаваць паскорыць рабочыя працэсы. Не дазваляйце беспадстаўным думкам і сумневам турбаваць вас, перш чым верыць чуткам, паспрабуйце высветліць іх крыніцу.

СКАРПІЁН. У вас усё добра. Проста атрымлівайце асалоду ад момантаў. Пры жаданні можна будзе рэалізаваць свае задумы. На рабоце будзе складвацца творчая і радасная атмасфера. Усё будзе атрымлівацца з мінімальнымі выдаткамі сіл і сродкаў. Дзякуючы добраму настрою, вы многім зможаце дапамагчы. Святкаванне пройдзе на ўра.

СТРАЛЕЦ. Самі вырашайце, як вам сустракаць Новы год. Не варта слепа давяраць меркаванням іншых людзей, нават калі яны з'яўляюцца для вас аўтарытэтам. На гэтым тыдні можа адбыцца пераход да новага, больш спрыяльнага для вас жыццёвага цыкла. Абвострыцца інтуіцыя, вам нават можа прысніцца прарочы сон. Аднак вы з куды большым поспехам будзеце вырашаць чужыя праблемы, чым свае ўласныя — вось імі і займіцеся.

КАЗЯРОГ. Памятаеце, што надыходзіць чароўная пара зімовых свят. Можа ўзрасці цікавасць да ўсяго, што вас атачае. Вялікая верагоднасць таго, што вы зможаце дакладна ацаніць сваё месца ў жыцці і нават зразумець, што ў ім важна, а што не. Магчыма ўвасабленне ў рэальнасць найбольш дзёрзкіх і славалюбівых жаданняў. Калі не будзеце ленавацца, ёсць магчымасць узляцець уверх па кар'ернай лесвіцы.

ВАДАЛІЙ. У пачатку тыдня вам проста неабходна менш працаваць і больш часу аддаваць падрыхтоўцы да свята. Сітуацыя, якая складзецца на гэтым тыдні, можа справакаваць вас на спрэчку з калегамі. Калі гэтага не пазбегнуць, паспрабуйце па-філасофску паставіцца да яе і ператварыць у займальную гутарку, гэта вам па сілах.

РЫБЫ. Адчуванне ўласнай значнасці паўстане не на пустым месцы. Так што зоркі рэкамендуюць з толкам выкарыстаць гэты плённы перыяд. Поспех у справах можа шмат у чым залежаць ад вашых арганізатарскіх здольнасцяў, хоць наўрад ці ўсё абыдзецца без канкурэнтнай барацьбы. Звыклы імідж будзе мець патрэбу ў некаторай карэкцыі. Перашкоды і праблемы, якія могуць закрануць вас у сярэдзіне тыдня, не павінны засмучаць. Да выхадных усё наладзіцца.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.28	16.54	7.26
Віцебск —	9.26	16.36	7.10
Магілёў —	9.19	16.44	7.25
Гомель —	9.06	16.49	7.43
Гродна —	9.42	17.11	7.29
Брэст —	9.34	17.20	7.46

Месяц

Поўня 22 снежня.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Аляксандра, Васіля, Сцяпана, Трыфана.*
К. *Эмы, Антона, Цэзара.*

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

28 СНЕЖНЯ

У краіне

1888 год — нарадзіўся (г. Мінск) Уладзіслаў Сямёнавіч Сакалдзінскі, беларускі спартсмен і трэнер (цяжкая атлетыка, барацьба). Адзін з заснавальнікаў у 1913 годзе першага ў Беларусі аддзялення Усерасійскага спартыўнага таварыства «Санітас». Выступаў у цырку. Быў трэнерам па цяжкай атлетыцы. Устанавіў усерасійскі рэкорд у жыме для штангістаў сярэдняй вагі (1913). Першы чэмпіён Мінска (1914) па французскай (грэка-рымскай) барацьбе ў сярэдняй вагавой катэгорыі і першы чэмпіён Мінска і Беларусі (1924) па гіравым спорце (пяцібор'і) у паўцяжкай вагавой катэгорыі. Памёр у 1976 годзе.

1913 год — у Вільні ў друкарні Марціна Кухты выйшаў зборнік вершаў Максіма Багдановіча «Вянок», адзіная прыжыццёвая кніга паэта, у якую ўвайшлі яго вершы і пераклады 1909—1912 гадоў.

1922 год — нарадзіўся (в. Будніца Віцебскага раёна) Ігнат Пятровіч Антонаў, неўрапатолаг, акадэмік НАН Беларусі, член-карэспандэнт Акадэміі медыцынскіх навук СССР, Расійскай Акадэміі медыцынскіх навук, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, народны ўрач Беларусі. Аўтар больш як 610 навуковых прац, у тым ліку 9 манаграфій, 18 вынаходак. Навуковыя працы па вывучэнні інфекцыйных сасудзістых і паразітарных захворванняў нервовай сістэмы. Правёў даследаванні па высвятленні патагенетычных механізмаў вострых парушэнняў мазгавога кровазвароту і захворванняў перыферычнай нервовай сістэмы, распрацаваў метады іх дыягностыкі і лячэння. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Памёр у 2015 годзе.

У свеце

Міжнародны дзень кіно. 28 снежня 1895 года ў «Вялікім кафэ» на бульвары Капуцынаў у Парыжы адбылася першая публічная дэманстрацыя «Жывой» фатаграфіі, якая рухалася, — сінематографа, вынайдзенага братамі Люм'ер.

1895 год — нямецкі фізік-эксперыментатар Вільгельм Конрад Рэнтген абвясціў аб адкрыцці ім выпрамянення, названага пасля яго імем (рэнтгенаўскія прамяні), і стварыў першыя рэнтгенаўскія трубкі. За гэтае адкрыццё, зробленае 8 лістапада 1895 года, вучоны быў узнагароджаны Нобелеўскай прэміяй (1901), стаўшы першым нобелеўскім лаўрэатам па фізіцы.

1903 год — нарадзіўся Міхаіл Канстанцінавіч Калатозаў, савецкі кінарэжысёр, народны артыст СССР. Зняў фільмы «Верныя сябры», «Валерый Чкалаў», «Ляцяць жураўлі» і іншыя. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР. Памёр у 1973 годзе.

1908 год — нарадзіўся Яўген Віктаравіч Вучэціч, савецкі скульптар, народны мастак СССР, правадзейны член Акадэміі мастацтваў СССР, Герой Сацыялістычнай Працы. Аўтар мемарыяльных ансамбляў у Трэптаў-парку (Берлін) і на Мамаевым кургане ў Валгаградзе, станкавай кампазіцыі «Перакуем мячы на аралы!», мармуровых партрэтаў вядомых военачальнікаў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1946, 1947, 1948, 1949, 1950). Памёр у 1974 годзе.

УСМІХНЕМСЯ

Хачу з хлопцам адзначыць Новы год дзесьці ў цёплай краіне.

Парайце, калі ласка, хлопца.

Дзеці — кветкі жыцця :)

Дзядзька пытаецца ў пляменніка (чатыры гады):

— Вы трымаеце дома якіх-небудзь жывёл?

Хлопчык:

— Трымаем! Кошку і марожаную скумбрыю!

Канец рабочага дня, а ў мяне на смартфоне зарад батарэі на дзевяноста працэнтах. Пакажу начальніку, можа ён мне прэмію выпіша?

— Чаму так мала дзяўчат-самелье?

— Таму што зробіць яна некалькі глыткоў віна і ўжо думае пра былога, і плача, што тоўстая.

У шостым класе мне купілі спартыўны касцюм на выраст. Я вырасла, скончыла школу, універсітэт, выйшла замуж, нарадзіла, і вось цяпер ён мне якраз.

У псіхіятра:

— Спробы суіцыду былі?

— Былі! 150 разоў з парашутам скакаў!

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4537.

Нумар падпісаны ў 19.30 27 снежня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

28 снежня 2018 г. № 52 (485)

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

НАШЫ ДЗЕЦІ

ПАДЗАРАДКА ДЛЯ МОЛАДЗІ



СТАРШЫНЯ Савета Рэспублікі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ наведаў Мінскі дзяржаўны каледж электронікі. Навучэнцы ўстановы расказалі аб сваіх дасягненнях і паказалі ўласна распрацаваныя праграмы для смартфонаў.

Фота Андрэя САЗОНАВА.

— Добра, што ў нашай краіне склалася такая традыцыя — сустракацца з дзецьмі напярэдадні Новага года, — сказаў Міхаіл Мясніковіч.— Асабліва каштоўнае тое, што мы сустракаемся з дзецьмі, якія маюць асаблівасці ў псіхафізічным развіцці. Ім увага патрэбна ўдвая. Нельга забываць прыходзіць да іх і на першае верасня, і да Новага года, ды ўвогуле, неабавязкова на святы.

Падчас візіту, парламентарый азнаёміўся з новымі праектамі навучэнцаў і іх побытам. Дарэчы, спікер верхняй палаты парламента ўжо бываў у гэтым каледжы. Упершыню ён наведаў установу яшчэ ў верасні мінулага года. Старшыня Савета Рэспублікі быў вельмі ўзрушаны талентамі дзяцей і шчыра радаваўся дасягненням навучэнцаў з Цэнтра прафесійнай і сацыяльнай рэабілітацыі, які існуе на базе каледжа з 2006 года. Там навучаюцца дзеці з абмежаванымі магчымасцямі, дзе яны атрымліваюць якасную адукацыю, у тым ліку і прафесійную. Па словах Міхаіла Мясніковіча, наймальнікі адзначаюць высокую падрыхтоўку навучэнцаў па запатрабаваных прафесіях.

Першая сустрэча з навучэнцамі, запланаваная для парламентарыя на гадзіну, расцягнулася амаль на тры. Будучыя спецыялісты атрымалі тады ў падарунак новыя камп'ютары. На працягу года дзеці добра займаліся, задаволеныя магчымасцю працаваць на сучасным абсталяванні камп'ютарнага класа. Вынікам сталі перамогі навучэнцаў на розных конкурсах і форумах. Так, напрыклад, дзеці ўзялі пяць медалёў толькі ў міжнародным конкурсе WorldSkills Belarus 2018.

стар. 2

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Пакіньце бальніцу!

У Багушэўску мясцовыя жыхары выступілі супраць змены статусу ўстаноў аховы здароўя. Як вырашылася справа? стар. 2

Чужых не бывае

Якія ўстановы наведваюць дэпутаты падчас дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» і якія падарункі прывозяць? стар. 3

Тэхналогіі для вёскі

Першыя рэзідэнты тэхнапарка «Горкі» ствараюць сельскагаспадарчых робатаў і лічбавыя прадукты для фермы. стар. 4

Альтэрнатыўная энергія

У Чэрыкаўскім раёне з'явіцца самы буйны сонечны парк. стар. 16

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

Адзначаючы па заслугах

Спікер верхняй палаты беларускага парламента прыняў удзел ва ўрачыстым мерапрыемстве, прымеркаваным да 100-годдзя БелТА.

Міхаіл Мясніковіч павіншаваў Беларускае тэлеграфнае агенцтва са святам. «За гэтай юбілейнай датай — велізарная праца высокапрафесійных журналістаў, людзей актыўных і творчых, людзей дзяржаўных. Дзякуючы кампетэнтнасці і прыстойнасці тых, хто працаваў у агенцтве раней, і тых, хто працуе сёння, БелТА заваявала павагу і аўтарытэт, стала надзейнай крыніцай аператыўнай і аб'ектыўнай інфармацыі пра падзеі ў Рэспубліцы Беларусь і за яе межамі», — цытуе яго словы прэс-служба верхняй палаты беларускага парламента.

За гады існавання агенцтвам назапашаны багатыя і ўнікальныя архівы, фота- і відэаматэрыялы, якія сталі жывой ілюстрацыяй гісторыі нашай краіны. «Выдатна, што агенцтва не стаіць на месцы, не здавольваецца дасягнутым, а ўдасканальвае сваю працу, укараняе сучасныя тэхналогіі, запускае новыя праекты», — дадаў старшыня Савета Рэспублікі.

Міхаіл Мясніковіч уручыў калектыву агенцтва Ганаровую грамату Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Узнагароды — за справу

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Міхаіл Мясніковіч правёў цырымонію ўзнагароджання памятнымі знакамі V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

У пачатку цырымоніі намесніку старшыні Савета Рэспублікі Марыяне Шчоткінай уручаны ордэн Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў «Садружнасць». Гэтая ўзнагарода прысуджаецца за ўнёсак у развіццё і ўмацаванне сяброўства паміж народамі краін СНД, паведамляе сайт Савета Рэспублікі.

Нагрудныя знакі ўручаны старшыні канцэрна «Беллегпрам» Мікалаю Яфімчыку, старшыні Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзіміру Цярэнцьеву, Андрэю Шорцу і кіраўніку кампаніі «Адані» Уладзіміру Лінёву. Узнагароды прысуджаны за актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, вялікі ўнёсак ва ўмацаванне беларуска-расійскіх адносін.

Бюджэт, роўмінг і адзіная прастора

Старшыні пастаянных камісій Савета Рэспублікі Ала Бодак, Аляксандр Папкоў, Віктар Сірэнка і Сяргей Рахманаў прынялі ўдзел у пасяджэнні 55-й сесіі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, якое прайшло ў Маскве ў мінулую суботу, 22 снежня.

Парламенцкі сход прыняў у другім чытанні бюджэт Саюзнай дзяржавы на 2019 год. Акрамя гэтага, саюзныя парламентарыі прынялі шэраг іншых бюджэтных рашэнняў, план міжнароднай дзейнасці і план-графік работы Парламенцкага сходу ў наступным годзе. На «ўрадавай гадзіне» была заслухана інфармацыя аб фарміраванні і функцыянаванні адзінай навукова-тэхналагічнай прасторы, а таксама пытанне адмены роўмінгу на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы.

Наступная, 56-я, сесія Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі пройдзе ў Беларусі.

ПАДЗАРАДКА ДЛЯ МОЛАДЗІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Пасля гэтага трыумфу дзеці напісалі парламентарыю ліст удзячнасці за магчымасць працаваць за сучаснымі камп'ютарамі. Навагоднім сюрпрызам, як для іх, так і для педагогаў установы, стала навіна, што ў рамках акцыі «Нашы дзеці» ў каледж зноў завітае высокі госць з навагоднімі падарункамі.

— Незвычайныя дзеці вучацца ў гэтай установе, — упэўнены Міхаіл Мясніковіч.— Нейкія свае фізічныя недахопы яны кампенсуюць стараннасцю ў вучобе. Як вынік — многія навучэнцы каледжа сталі пераможцамі гарадскіх і рэспубліканскіх алімпіяд, яны стаяць у адным радзе з навучэнцамі вядучых ліцэяў і каледжаў краіны.

Яўген Шапавал, адзін з навучэнцаў каледжа, упэўнены, што ва ўстанове ёсць магчымасць рэалізаваць сябе і быць заўважаным.

— Працуеш год побач з іншымі і бачыш, што ўсё гэта цікава не толькі табе,— расхвалявана расказвае хлопец. — Гэта нейкая падзарадка, якая матывуе і надае моц рухацца да новых вышынь. Сёлета я стаў пераможцам у праграме «100 ідэй для Беларусі» ў Мінску. Удзельнічаў у розных форумах, выстаўках тэхнічнай творчасці, алімпіядах па працоўным навучанні, якія палюбіў яшчэ са школы.

Сам Яўген цікавіўся электронікай з дзяцінства. У дванаццаць гадоў сабраў сваю першую падводную лодку з маторам. Праверыў яе работу ў звычайным возеры... Яна паспяхова паплыла, як тарпеда!

— Я быў страшэнна задаволены сабой, — успамінае Яўген.— Пакуль не зразумеў, што не паклапаціўся аб тым, каб яна магла вяртацца назад! Цяпер вось ляжыць на дне возера —ніяк не дастаць.

На працягу 11 гадоў Мінскі дзяржаўны каледж электронікі з'яўляецца адным з найлепшых сярод устаноў сістэмы сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі. 48 навучэнцаў сталі лаўрэатамі спецфонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі. У каледжы наладжана сістэма бесперапыннай адукацыі. Заключаны дагаворы на навучанне з вядучымі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі краіны. Выпускнікі каледжа, якія атрымалі сярэднюю спецыяльную адукацыю, маюць магчымасць працягнуць сваё навучанне і атрымаць у скарочаны тэрмін вышэйшую адукацыю па 42 спецыяльнасцях у ВНУ краіны. У Цэнтры прафесійнай і сацыяльнай рэабілітацыі для людзей з асаблівасцямі ў псіхафізічным развіцці займаюцца 69 дзяцей, з іх 7 — з парушэннем апорна-рухальнага апарату, а астатнія з парушэннем слыху. Навучэнцы атрымліваюць кваліфікацыі аператара ЭВМ, аператара камп'ютарнай графікі, слесара-зборшчыка бытавой тэхнікі, слесара механазборачных работ, тэхніка-праграміста. З верасня будучага года плануецца навучанне інвалідаў па зроку па спецыяльнасці «эксплуатацыя электронна-вылічальных машын». За 12 гадоў цэнтр падрыхтаваў больш за 400 спецыялістаў.

«Рыхтаваць моладзь з вышэйшай адукацыяй важна і трэба, але не менш патрэбны высокакваліфікаваныя спецыялісты з сярэдняй адукацыяй. Каледж электронікі якраз і адпавядае тым патрабаванням, якія дыктуе нам жыццё», — дадаў Міхаіл Мясніковіч.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Фота Андрэя САЗОНАВА.

ДЫЯЛОГ

Што на карысць людзям — на карысць дзяржаве

У Багушэўску ў мясцовай бальніцы з 1 студзеня зноў будуць функцыянаваць тэрапеўтычныя ложкі, а амбулаторыя стане паліклінікай. Менавіта на гэтым настойвалі жыхары гарадскога пасёлка, звяртаючыся ў Віцебскі абласны выканаўчы камітэт і Адміністрацыю Прэзідэнта.

На сустрэчу, што прайшла ў гарадскім пасёлку, прыехаў **Аляксандр ПАПКОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні.** Прыехаў па запрашэнні багушэўцаў, якія ведаюць яго па рабоце ў Палаце прадстаўнікоў, дзе ён прадстаўляў Сенненшчыну і Багушэўск у прыватнасці, у курсе праблем рэгіёна і пасёлка. Некаторыя з іх вырашаліся пры яго актыўным удзеле.

— Якасць медыцынскага абслугоўвання трэба павышаць далей, працаваць над вырашэннем іншых эканамічных і сацыяльных праблем. Багушэўск можа і павінен стаць пунктам росту для ўсёй Сенненшчыны, — адразу выказаў сваё меркаванне Аляксандр Папкоў. — Будуць створаны належныя ўмовы для жыцця, прыйдуць у пасёлак і інвестары. Наяўнасць чыгуначнай станцыі, разгалінаванай сеткі аўтамабільных дарог, нарэшце, блізкасць да такіх буйных прамысловых цэнтраў, як Віцебск і Орша, таксама паспрыяюць станоўчым зменам.

На яго думку, мясцовым органам улады трэба ўзважана, нават крытычна, ставіцца да рэкамендацый сталічных ведамстваў і міністэрстваў. Асабліва калі гэта датычыцца фінансавага складніка.

— Грошай заўжды не хапае. Але сэканоміць сёння — не абавязкова атрымаць добры вынік заўтра, тым больш у медыцынскай сферы. Тут галоўны ўхіл, згодна з дзяржаўнай палітыкай, робіцца на прафілактыку захворванняў. Таму медыцынскія ўстановы трэба ўмацоўваць кадрамі і матэрыяльна, — даводзіў Аляксандр Папкоў.

Асабліва жыхары гарадскога пасёлка занепакоіліся, калі даведаліся, што мясцовая бальніца набыла статус сястрынскай, а паліклініка стала амбулаторыяй. Людзі баяліся, што ў выніку такіх змен пагоршацца якасць і аб'ём медыцынскага абслугоўвання.

У Сенненскім райвыканкаме своечасова далі задні ход прынятым раней рашэнням. І такія дзеянні ўлады толькі павысілі яе аўтарытэт, бо сведчаць аб сталасці мыслення і гатоўнасці весці дыялог з насельніцтвам на роўных.

— Ініцыятыва людзей, органаў самакіравання ўхваляецца. Важна, каб яна грунтавалася на рэальнай аснове, — выказаўся ў час сустрэчы з багушэўцамі **Васіль ЧАРАДНІК, старшыня Сенненскага райвыканкама**. Па яго распараджэнні складзены пратакол даручэнняў, які ўжо зняў напружанасць, дазволіць у кароткі час дэтальна і аб'ектыўна вывучыць стан медыцынскага абслугоўвання, работу пасажыраперавозчыкаў, экалагічную сітуацыю і іншыя праблемы, што хвалююць жыхароў гарадскога пасёлка.

Шмат тлумачэнняў давялося даваць **Юрыю ДЗЕРКАЧУ, начальніку Віцебскага абласнога ўпраўлення аховы здароўя,** — ён, дарэчы, таксама з'яўляецца членам Савета Рэспублікі. У размове ўдзел прымалі кіраўнікі і спецыялісты многіх іншых аддзелаў і ўпраўленняў райвыканкама і аблвыканкама. На Віцебшчыне распрацаваны графік добраўпарадкавання населеных пунктаў гарадскога тыпу. Асноўныя работы ў Багушэўску пачнуцца ў 2019 годзе. На некаторых аб'ектах будаўнікі ўжо працуюць.

Аднак канкрэтыкі, нават па іх фінансаванні, не кажучы пра такія праекты, як рэканструкцыя ачышчальных збудаванняў, да гэтага часу няма. І тут — і раённыя ўлады, і насельніцтва — зноў разлічваюць на дапамогу Аляксандра Папкова.

Аляксандр ЛАЗЮК.

Кампетэнтна

Алег ЦЯЦЮЕЎ, кіраўнік справамі Сенненскага райвыканкама:

— Да канца года ў рашэнне райвыканкама № 776 ад 26 верасня 2018 года будуць унесены змены — у прыватнасці ў п. 3. Дакладнай фармуліроўкі пакуль што няма. Але ў тым, што тэрапеўтычная дапамога ў Багушэўскай бальніцы хворым будзе аказвацца ў тым жа аб'ёме, што і раней, няма сумненняў. Гарантыя таму — пратакол даручэнняў старшыні райвыканкама.

ПАТРЭБНАЯ ЎВАГА

Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Марыяна ШЧОТКІНА наведала Быхаўскі псіханеўралагічны дом-інтэрнат.

Яна павіншавала жыхароў дома-інтэрната з надыходзячым Новым годам і адзначыла, што напярэдадні навагоднiх і калядных свят маюць патрэбу ва ўвазе не толькі малыя, але і пажылыя людзі і інваліды.

Як паведамляе сайт верхняй палаты беларускага парламента, у гэты ж дзень намеснік старшыні Савета Рэспублікі на пасяджэнні Магілёўскага аблвыканкама ўручыла Ганаровую грамату Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь аблвыканкаму за вялікі ўнёсак у рэалізацыю сацыяльнай і эканамічнай палітыкі нашай краіны, падрыхтоўку і правядзенне V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

* * *

26 снежня **старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар СІРЭНКА** ў рамках навагодняй дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» наведаў Старасвержанскую сярэднюю школу Стаўбцоўскага раёна. Падчас урачыстага мерапрыемства парламентарый павіншаваў дзяцей, бацькоў і педагогаў з Калядамі і надыходзячым Новым годам і ўручыў навучэнцам навагоднія падарункі.

Як жывецца ў новым доме?

Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ учора наведаў Сенненскую школу-інтэрнат. Прыехаў менавіта туды, каб убачыць на свае вочы, як жывуць тыя, каго раней выхоўвалі ў іншых установах.

— Летась у рамках аптымізацыі ўстаноў адукацыі закрылі Друйскі дзіцячы дом Браслаўскага раёна і Вялікалятчанскі — Віцебскага. І частку дзяцей адтуль перасялілі ў Сянно. Таму мая мэта — не толькі прыехаць з падарункамі, але і паглядзець, як ім жывецца на новым месцы, наколькі яны па-сямейнаму адчуваюць сабе ў новым агульным доме, — адзначыў суразмоўнік.

А сёння, 28 снежня, Уладзімір Цярэнцьеў прыехаў у сваю акругу. Пабываў у аграгарадку Бычыха і ў гарадскім пасёлку Езярышча Гарадоцкага раёна.

Ён расказаў, як народныя выбраннікі дапамагаюць тым, хто мае ў гэтым патрэбу. Напрыклад, адзін з дэпутатаў апякае сям'ю, у якой выхоўваюцца пяцёра дзяцей. Не афішуючы, пастаянна дапамагае чым можа. І такіх прыкладаў, як падкрэсліў старшыня абласнога Савета, дзясяткі.

Хворым дзецям — цяпло душы

Навагоднее свята прыйшло і да дзетак, якія знаходзяцца ў Гомельскім абласным доме дзіцяці для дзяцей з паражэннем цэнтральнай нервовай сістэмы і парушэннем псіхікі. Там з падарункамі пабывалі **старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЕНКЕВІЧ, кіраўнік Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа і дэпутат абласнога Савета Ала СМАЛЯК**, а таксама члены прэзідыума абласнога Савета дэпутатаў. У межах акцыі «Нашы дзеці» госці падаравалі 56 дзеткам, якія цяпер знаходзяцца ў гэтай установе, сродкі гігіены, салодкія падарункі і цёплыя словы падтрымкі.

Дэпутаты ў навагоднім карагодзе

Кіраўнікі абласнога і гарадскога Саветаў дэпутатаў павіншавалі з Новым годам выхаванцаў школы-інтэрната для дзяцей з парушэннямі зроку.

Падчас акцыі «Нашы дзеці» было ўсё: і карагоды вадзілі, і казку пра чароўны гадзіннік глядзелі, і ласункамі частаваліся. На свята да дзетак з падарункамі завіталі **старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў, лідар абласнога аддзялення рэспубліканскай арганізацыі «Белая Русь» Ігар ЖУК, старшыня гарадскога Савета дэпутатаў Барыс ФЁДАРАЎ**, прадстаўнікі дэпутацкага корпуса вобласці і горада.

Педагогі і выхаванцы школы-інтэрната ператварыліся ў казачных персанажаў, за якімі назіралі і дзеці, і госці. Усе яны сышліся ў агульным карагодзе вакол ёлкі разам з Дзедам Марозам і Снягуркай.

— У акцыі «Нашы дзеці» актыўны ўдзел прымаюць і дэпутаты, і грамадскія арганізацыі. У гэтыя дні яны наведваюць дзіцячыя калектывы, віншуюць з надыходзячым святам. І гэта, безумоўна, добрая традыцыя, якая пакіне цёплы ўспамін у дзіцячых сэрцах, — адзначыў Ігар Жук.

Ён пажадаў усім поспехаў у новым годзе, асабліва дзеткам з парушэннямі зроку, бо ім прыходзіцца цяжэй, чым зоркім аднагодкам. Але ў краіне створаны добрыя ўмовы для таго, каб кожны мог рэалізаваць сябе ў жыцці. Вялікую дапамогу ў гэтым аказваюць педагогі, усе работнікі школы-інтэрната. Як расказаў **намеснік старшыні абласнога Савета дэпутатаў Юрый АЛЯКСЕЙ**, падчас свята было вельмі прыемна назіраць за ўзаемадзеяннем дзяцей і педагогаў.

— Здавалася, што дарослыя ведаюць, у які момант дзіцяці трэба аказаць падтрымку, у чым яму дапамагчы. Таксама відаць добры кантакт паміж бацькамі і работнікамі школы-інтэрната. Такая згуртаванасць дарослых і дзетак вельмі ўразіла. Адчуваецца, што калектыў аддае сябе поўнасцю ў рабоце з малымі, — падкрэсліў Юрый Аляксей.

Ніхто не застаўся без падарунка, іх было шмат, як і гасцей. Бо ў акцыі таксама прынялі ўдзел і шэфы — прадстаўнікі розных арганізацый горада.

Камп'ютар, цацкі і цукеркі

Старшыня Магілёўскага абласавета дэпутатаў Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК наведаў на гэтым тыдні Веснаўскі дом-інтэрнат для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Выхаванцам установы ён перадаў развівальныя цацкі, камп'ютар і цукеркі.

— Гэта ўсё вельмі патрэбныя нам рэчы, — падзяліўся радасцю **дырэктар дома-інтэрната Вячаслаў КЛІМОВІЧ.** — Мы загадзя ўзгаднілі, чаго нам не стае, і вельмі задаволены гэтай дапамогай. Нашым дзецям не заўсёды хапае стасункаў, больш цесных кантактаў. І падарункі дапамогуць кампенсаваць гэты прабел. Наогул для нас вельмі важная гэта ўвага, і тое, што яна не зводзіцца да нейкай разавай акцыі. З многімі, хто да нас прыязджае, звязваюць моцныя сяброўскія і дзелавыя сувязі.

Разам са старшынёй аблсавета дом-інтэрнат наведалі **кіраўнік СЭЗ «Магілёў» Андрэй ЯРЦАЎ** і **старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне аблвыканкама Святлана ТАРАСЕНКА**. Яны таксама прывезлі дзецям цукеркі і падарункі.

Дарэчы, у рамках акцыі «Нашы дзеці» дэпутаты аблсавета і Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пабывалі і ў Магілёўскай абласной дзіцячай бальніцы.

Таямніца чароўнага гадзінніка і сустрэча са Снегавіком-паштавіком

Сёння, 28 снежня, **старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля ЯКУБІЦКАЯ** прыняла ўдзел у абласным дабрачынным навагоднім свяце, якое адбылося ў Маладзечне. На ўрачыстасць прыехалі больш як 800 юных жыхароў цэнтральнага рэгіёна.

Традыцыйна ўдзельнікамі гэтага маштабнага мерапрыемства сталі дзеці са шматдзетных, малазабяспечаных і прыёмных сем'яў, інваліды, а таксама актывісты кадэцкага і маладзёжнага руху, адораныя і таленавітыя навучэнцы Міншчыны.

Хлопчыкі і дзяўчаткі паглядзелі маляўнічае шэсце Дзядоў Марозаў і Снягурак, сустрэліся з казачнымі героямі, паўдзельнічалі ў віктарынах, конкурсах, інтэрактыўных гульнях. Дзятва пабывала на «Лясной паляне», «Навагоднім кірмашы», у «Доміку Дзеда Мароза», «Казачным каралеўстве». Удзельнікі свята паспрабавалі свае сілы ў конкурсе «Угадай мелодыю», пазнаёміліся са Снегавіком-паштавіком, напісалі ліст са сваімі пажаданнямі Дзеду Марозу.

Аматары шахмат паўдзельнічалі ў выстаўцы «Шахматная феерыя». Музычныя пляцоўкі «Навагодні танцпол» і «Чароўныя ноткі» стварылі святочны настрой, падарылі магчымасць выканаць любімыя песні і проста патанцаваць.

У гарадскім Палацы культуры госці змаглі дапоўніць свой вобраз аквагрымам, захаваць цудоўныя імгненні мерапрыемства ў фотазонах. А пляцоўкі МНС і ДАІ не дазволілі дзецям падчас навагодніх свят забываць аб правілах бяспечных паводзін.

Фота Таццяны СКРЫПНІЧЭНКІ.

Напрыканцы мерапрыемства дзеці разам з казачнымі героямі сталі ўдзельнікамі тэатралізаванага прадстаўлення «Таямніца чароўнага гадзінніка». Ну, і вядома, атрымалі салодкія падарункі ад кіраўніцтва Мінаблвыканкама, абласнога Савета дэпутатаў, Маладзечанскага райвыканкама і галоўнага ўпраўлення адукацыі Мінаблвыканкама.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Маргарыта УШКЕВІЧ.
Нэлі ЗІГУЛЯ.

Пад Новы год — кватэру

Як дэпутаты дапамаглі маладой сям'і ўладкавацца на малой радзіме

Алена ШКАЛКО нават не разлічвала, што сёлетні Новы год яна з сям'ёй сустрэне ў сваёй кватэры. Толькі пасля звароту да дэпутатаў Гродзенскага абласнога Савета яе мары сталі рэальнасцю. Каб дапамагчы маладой сям'і, службы Шчучынскага раёна ўзялі на сябе ролю добрых чараўнікоў. І пад Новы год сям'я ўрачыста атрымала не толькі адрамантаваную кватэру, але і шмат падарункаў.

Сваю гісторыю Алена Шкалко расказала падчас сустрэчы з дэпутатам абласнога Савета, намеснікам старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктарам Лісковічам, які праводзіў у Шчучыне прыём грамадзян. На ім прысутнічала і **намеснік старшыні райвыканкама**, таксама **дэпутат абласнога Савета Алена ПАСЮТА**. Яна ўспамінае:

— Я добра памятаю тую сустрэчу, бо сама якраз напярэдадні заступіла на новую пасаду, а крыху раней была абрана ў абласны дэпутацкі корпус. Можна лічыць, што гэта стала маім першым выпрабаваннем на годнасць. Хацелася максімальна поўна задаволіць патрэбы тых, хто прыйшоў на прыём. Адразу звярнула на сябе ўвагу жанчына з двума дзецьмі, адно з якіх — інвалід. Аказалася, што яе завуць Алена Шкалко. Яна расказала простую, але разам з тым шчымлівую гісторыю сваёй сям'і. І тое, як яна гаварыла, як бязмерна клапацілася пра свайго мужа і дзяцей, вельмі падкупляла.

Фота Алы БІБІКАВАЙ.

Як высветлілася, жанчына не адзін год шукала шчасце ў горадзе, выйшла замуж, нарадзіла дваіх дзяцей. Але жыццё складвалася не вельмі спрыяльна, таму ў рэшце рэшт сям'я прыняла рашэнне вярнуцца на малую радзіму Алены — у вёску Дубрава, дзе жыве яе маці. Туды летась і пераехала маладая сям'я. Муж уладкаваўся жывёлаводам у мясцовую гаспадарку — філіял «Жалудоцкі агракомплекс», Алена гадавала дзяцей. Але бытавыя ўмовы, цесната, а галоўнае — пячное ацяпленне, негатыўна ўплывалі на стан здароўя дзетак, асабліва малодшай дачкі — інваліда.

— Мы ўзялі гэта пытанне на кантроль, — растлумачыла дэпутат і намеснік старшыні райвыканкама Алена Пасюта. — Падключыліся шматлікія службы — гэта і сельскі Савет, і жыллёва-камунальная гаспадарка, і сельгаспрадпрыемства. Сталі думаць, як дапамагчы маладой сям'і.

І выйсце знайшлося. У вёсцы Дубрава пуставала кватэра з жыллёвага фонду камерцыйнага прызначэння ў васьмікватэрным доме. Былыя жыхары з'ехалі, але кватэра патрабавала істотных сродкаў. Да таго ж былі праблемы ў юрыдычным плане. Але перад дэпутатамі стаяла канкрэтная задача — дапамагчы сям'і і падрыхтаваць кватэру для пражывання.

— Хачу асабліва звярнуць увагу на станоўчы вопыт міжведамаснага ўзаемадзеяння, — падкрэсліла Алена Пасюта. — Калі і мясцовае сельгаспрадпрыемства, і раённая ЖКГ, і школа, і райвыканкам пачалі рабіць агульную справу. Былі знойдзены сродкі, каб за некалькі месяцаў адрамантаваць кватэру і даць магчымасць ім засяліцца.

Такім чынам, былі заменены вокны, дзверы, ацяпленне, сантэхніка. За кошт спонсараў атынкавалі сцены, столь, паклалі лінолеум. Жыхары выказалі жаданне рабіць далейшы рамонт самі, на свой густ. А нядаўна сям'ю Шкалко наведалі прадстаўнікі ўлады, грамадскіх арганізацый і, канешне, іх спонсары. Яны прыйшлі ў новую кватэру з падарункамі.

— Нам вельмі прыемна ўдзельнічаць у дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» з рэальнай справай, — адзначыла Алена Пасюта. — Няхай дзеткі растуць шчаслівыя ў гэтым доме.

Сям'я падзякавала ўсім, хто далучыўся да добрай справы, дапамог з вырашэннем жыллёвага пытання, рамонтам і добраўпарадкаваннем. Напярэдадні Новага года ў маладой сям'і пачынаецца і новы адлік часу, больш шчаслівы. Як яны ўпэўніліся, па шчасце не трэба далёка ехаць, яно тут, на малой радзіме.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Эфектыўнасць вытворчасці і занятасць насельніцтва — у прыярытэце

На сумесным пасяджэнні Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта і сесіі абласнога Савета дэпутатаў разгледжаны ключавыя паказчыкі сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна ў 2019 годзе. Вызначаны прыярытэты эфектыўнага гаспадарання ўсіх галін вытворчасці.

Падчас разгляду асаблівая ўвага дэпутатамі і кіраўнікамі выканаўчай улады аддавалася пытанням занятасці і працаўладкавання грамадзян. **Намеснік старшыні аблвыканкама Андрэй КЛЕЦ** адзначыў, што на рабочыя месцы, створаныя за кошт новых вытворчасцяў плануецца ўладкаваць не менш за 6,3 тысячы чалавек. Новыя месцы работы жыхары абласнога цэнтра і раёнаў атрымаюць у тым ліку на дзеючых вытворчасцях. Але асаблівы акцэнт робіцца на развіццё малога бізнесу. У сферы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў вобласці будзе створана больш за 700 арганізацый. 380 з іх запланавана адкрыць у абласным цэнтры, у Баранавічах — 62, у Пінску — 53.

Па кожным раёне вызначаны паказчыкі прадукцыйнасці працы, экспарту тавараў і паслуг, а таксама прыцягнення замежных інвестыцый, валавой прадукцыі прамысловасці і сельскай гаспадаркі, будаўніча-мантажных работ, тавараабароту ў гандлі. Праграма работы ёсць, засталося яе зацвердзіць ва ўстаноўленым законам парадку і выконваць на кожным прадпрыемстве, на кожнай вытворчасці.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

РЫНАК ПРАЦЫ

Ці можа беспрацоўны стаць айцішнікам?

У Віцебскай вобласці 2179 беспрацоўных — сёлета іх на 40 % меней, чым летась. А вакансій прыкладна 6680 — на 55 % больш.

Адпаведныя заданні ўрада і аблвыканкама па працаўладкаванні выкананы амаль што на 100 %. Тых, каму дапамаглі знайсці сябе на рынку працы, — каля 19,3 тысячы чалавек. Гэта тыя, хто афіцыйна не стаў беспрацоўным, але трапіў пад скарачэнне ці страціў работу ў іншых выпадках.

Узровень сярэдняй зарплаты ў рэгіёне — 849 рублёў — на 19,4 % больш, у параўнанні з канцом мінулага года. У Віцебскай вобласці ўзровень беспрацоўя не вылучаецца на фоне іншых — 0,4 %. Аналагічны ўзровень напружанасці на рынку працы.

У глыбінцы па-ранейшаму вельмі запатрабаваныя трактарысты, аграномы, жывёлаводы, аператары машыннага даення. А таксама — леснікі і фельчары.

А ў цэлым па вобласці не хапае швачак, кіроўцаў, кухараў, зборшчыкаў абутку, фрэзероўшчыкаў, электраманцёраў па рамонце і абслугоўванні электраабсталявання і гэтак далей.

Заробкі для некаторых дэфіцытных спецыялістаў годныя. Даяркам, напрыклад, прапануюць каля 1000 рублёў, кіроўцам нават 1200, заатэхнікам — каля 1,1 тысячы. Нават прыбіральшчыкам гатовыя плаціць каля 730 рублёў у месяц.

Канешне, не ўсюды, але, калі паспець заявіць пра сабе, возьмуць на работу.

Можна і падпрацаваць: на зборы камянёў, прыборцы тэрыторый і гэтак далей. Сёлета ўсяго каля чатырох тысяч чалавек бралі ўдзел у такіх так званых грамадскіх аплачваемых работах.

Дарэчы, афіцыйна беспрацоўным аўтарам тэкстаў могуць выдзеліць суму на набыццё абсталявання, арэнду памяшкання, аплату сувязі і гэтак далей. Сума, якую не трэба вяртаць, немалая — да 15 базавых велічынь (памер адной — 24,5 рубля). Але пералічаць грошы, калі будзе ўзгоднены бізнес-план, і атрымаецца рэальны вынік. У маім выпадку — артыкулы, якія надрукавалі б.

На жаль, курсаў на «біржы працы», каб ахвотных вучылі на айцішнікаў, на сёння няма. Але, калі чалавек недзе вывучыцца за свае грошы або самастойна асвоіць гэтую дзейнасць, па згаданай вышэй схеме дапамогуць стварыць рабочае месца.

Між іншым, ёсць прыклады, калі людзі з вышэйшай адукацыяй становяцца рамеснікамі. Напрыклад, адзін зарабляе на веніках!

А чаму б інтэлігенту не заняцца сельскім турызмам? Тым больш што падатак — базавая велічыня ў год.

2.30 Іронія лёсу. Працяг (12+).
4.35 Міфы (16+).

Discovery

6.00 Дзікая прырода Расіі (16+).
7.45, 4.25 Гульні розуму (16+).
8.35 Пачатак (16+).
10.15, 18.45, 0.25 Асушыць акіян (16+).
11.45 Кітайская мегаграбніца (16+).
12.35 Закінутыя скарбы Змяіных цароў мая (16+).
13.20 Лініі Наска (16+).
14.10 Росквіт Атлантыды (16+).
14.55, 20.25 Гісторыя дзесяцігоддзяў (16+).
16.25 Супердубаванні (16+).
17.15 Расследаванні авіякатастроф (16+).
22.00 Марс (16+).
1.55 Невядомая планета Зямля (16+).

National Geographic

8.00, 7.10 Апошнія жыхары Аляскі (16+).
11.00, 16.00 Будаўнікі караблёў-гігантаў (12+).
17.00, 21.00, 0.00 Пяцёрка найлепшых (12+).
1.00, 3.50 Самагоншчыкі (16+).
4.40 Паляўнічыя на старызну (12+).

ЛІТОЎСКІ ДЭСАНТ НА СУМЕЖЖЫ

Прадстаўнікі мясцовага самакіравання літоўскага Шальчынінкая і беларускага Воранава ўзнаўляюць былыя сувязі

У літоўцаў заўсёды мелася зацікаўленасць тым, як жывуць беларусы. Раней гэта былі блізкія суседзі, не існавала дзяржаўнай мяжы, раёны сябравалі на ўзроўні культурных і грамадскіх арганізацый, шмат было і асабістых кантактаў. І зараз нямала родных жывуць з абодвух бакоў мяжы і па магчымасці падтрымліваюць сувязі. А вось міждзяржаўныя адносіны аслабелі. Масавы прыезд прадстаўнікоў Літвы напрыканцы года стаў новым імпульсам да супрацоўніцтва. Госці пабывалі на сельскагаспадарчых прадпрыемствах, аб'ектах некалькіх сельскіх саветаў, ва ўстановах адукацыі, у тым ліку наведалі Пеляскую сярэднюю школу з літоўскай мовай навучання.

Фота Вольгі ВАРАБЁЙ.

Вялікую дэлегацыю з Шальчынінкая ўзначаліла віцэ-мэр раёна Ядвіга Сінкевіч. Для абмену вопытам прыехалі прадстаўнікі аддзела адукацыі, кіраўнікі школ і дзіцячых садкоў, члены беларускага грамадскага таварыства, фермеры. Папярэднічала прыезду падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Воранаўскай раённай арганізацыяй «Беларускі саюз жанчын» і Шальчынінкайскім беларускім культурным цэнтрам «Раніца». Падчас сустрэчы кіраўніка цэнтра з раённымі ўладамі было вырашана арганізаваць прыезд літоўскай дэлегацыі.

– Многія прадстаўнікі нашай дэлегацыі маюць беларускія карані, некаторыя нават працавалі ў Воранаўскім раёне, – расказала старшыня беларускага цэнтра «Раніца» Рэгіна Дзмухоўская. – Таму многім цікава пабываць тут зноў, праз гады. Шмат фермераў выказалі жаданне прыехаць, у складзе дэлегацыі – іх палова. Таксама нямала і прадстаўнікоў сістэмы адукацыі.

Можна сказаць, гэты візіт стаў самым масавым за многія гады – прыехала каля 30 чалавек. Фарміраванне дэлегацыі адбывалася з улікам прыярытэтаў развіцця Воранаўскага раёна – сельская гаспадарка і адукацыя.

– Суседзі заўсёды цікавіліся нашымі дасягненнямі, тым, як ідуць справы ў розных галінах, як развіваецца інфраструктура, – зазначыла **старшыня Воранаўскага Савета дэпутатаў Алена ГАНЕВІЧ.** – Цікавіла літоўцаў развіццё сельскагаспадарчага кірунку, таму што ў нас дзяржаўная форма ўласнасці, а ў іх усё даўно перайшло ў прыватныя рукі.

Члены дэлегацыі змаглі ўпэўніцца ў сістэмнасці, вынікавасці малочнатаварных фермаў. Яны звярнулі ўвагу на парадак, механізацыю працы, узровень земляробства, нарыхтоўку кармоў, увогуле высокі ўзровень сельскай гаспадаркі.

Бакі дамовіліся аб далейшай сустрэчы паміж фермерамі і прадстаўнікамі сельскагаспадарчых прадпрыемстваў «Эліт-Агра-Больцінікі» і «Доцішкі». Беларускія сельгасвытворцы маюць намер працаваць з літоўскімі калегамі па інвестыцыйных кірунках.

– Воранаўскі і Шальчынінкайскі раёны ў многім падобныя – яны аграрныя раёны. Толькі ў нас сельская гаспадарка ўся прыватная, – паведаміў фермер і дэпутат з Шальчынінкая Тадэвуш Рудзіс. – Раней я таксама працаваў у дзяржаўным сектары, цяпер амаль дваццаць гадоў займаюся раслінаводствам і жывёлагадоўляй. Да мяне далучыўся і сын Анджэй. Мы прыехалі сюды разам. Лічу, што для яго будзе карысна ўбачыць, як развіваецца ў сучасных умовах сельская гаспадарка нашых беларускіх суседзяў. Лічу, ёсць сэнс наладзіць партнёрскія зносіны з беларускім сельгаспрадпрыемствам.

Яшчэ адзін сумесны кірунак дзейнасці – адукацыя. Прадстаўнікі Літвы пагадзіліся, што ў Воранаўскім раёне напрацавана салідная матэрыяльная база сярэдніх і дашкольных устаноў. Яны наведалі сярэднія школы ў аграгарадках Беняконі і Доцішкі, дзіцячы садок у Больцініках, пабывалі ў вёсцы Пеляса, дзе працуе школа з літоўскай мовай навучання. Прадстаўнікі літоўскай дэлегацыі адзначылі высокі ўзровень навучання, добрую падрыхтоўку педагогаў. Беларускія калегі прапанавалі наладзіць сумесную работу па абмене вопытам паміж педагогамі, арганізаваць агульныя маладзёжныя праекты.

– Праблемы гэтага асяроддзя ў нас аднолькавыя – адмова ад шкодных звычак, здаровы лад жыцця, далучэнне да працы, дэмаграфічная сітуацыя. Гэта актуальна для абедзвюх краін, – падкрэсліла Алена Ганевіч.

Цікавіла літоўскіх гасцей і работа мясцовага самакіравання – тое, як будуецца сістэма органаў улады, узаемадзеянне паміж выканаўчай і прадстаўнічай уладамі. Яны атрымалі адказ на пытанне, якім чынам на месцы клапоцяцца аб дабрабыце насельніцтва, як дасягаюць гэтай мэты ў дачыненні да сельскіх жыхароў, як працуюць з імі. Наогул, як развіваюцца сельскія тэрыторыі Воранаўскага раёна.

Абмеркаваць больш паслядоўна канкрэтныя кірункі дзейнасці беларусы маюць намер пасля візіту ў Літву. Пакуль запланавана наведаць суседні раён вясной будучага года.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Извещение о проведении открытого аукциона на право заключения договоров аренды нежилых помещений

Организатор аукциона – РУП «Белтелеком» в лице Брестского филиала, расположенного по адресу: г. Брест, пр-т Машерова, 21-2.

На аукцион выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества, которое представляет собой:

1. Помещения на 4-м этаже в капитальном строении (здание АТС-3) общей площадью 425,6 кв. м (в том числе: лот № 1 – 355,9 кв. м; лот № 2 – 37,6 кв. м; лот № 3 – 21,1 кв. м; лот № 4 – 11,0 кв. м) по ул. Звездная, д. 3 в г. Пинске Брестской области:

Лот № 1:

Начальная цена продажи права заключения договора аренды составляет:

1БАВ * 0,25 * 355,9 = **88,975 БАВ.**

Размер задатка составляет:

88,975 * 0,1 = **8,8975 БАВ.**

Лот № 2:

Начальная цена продажи права заключения договора аренды составляет:

1БАВ * 0,25 * 37,6 = **9,4 БАВ.**

Размер задатка составляет:

9,4 * 0,1 = **0,94 БАВ.**

Лот № 3:

Начальная цена продажи права заключения договора аренды составляет:

1БАВ * 0,25 * 21,1 = **5,275 БАВ.**

Размер задатка составляет:

5,275 * 0,1 = **0,5275 БАВ.**

Лот № 4:

Начальная цена продажи права заключения договора аренды составляет:

1БАВ * 0,25 * 11,0 = **2,75 БАВ.**

Размер задатка составляет:

2,75 * 0,1 = **0,275 БАВ.**

Срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи права и задатка согласно п. 8.2 Положения о порядке определения размера арендной платы, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 № 150; коэффициент – 3,0; целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещение офиса, складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли.

Аукцион состоится 30 января 2019 года в 14.00 по адресу: 224030 г. Брест, пр. Машерова, 21-2 в малой студии Брестского филиала РУП «Белтелеком»

Документы на участие в аукционе принимаются с 29 декабря 2018 года по 29 января 2019 года в рабочее время с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: 224030 г. Брест, пр. Машерова, 21-2, каб. № 416.

Для участия в аукционе участник аукциона в срок, установленный для приема документов:

– перечисляет задаток на р/с Брестского филиала РУП «Белтелеком» № BY26AKBB30121001100011000000 ф-л № 100 БОУ ОАО «АСБ Беларусбанк» (BIC) AKBBBY21100, УНП 201003265.

– подает заявление на участие в аукционе;

– заключает соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;

– предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

– физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;

– индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;

– юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона **обязан**:

1) в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка;

2) возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись;

3) заключить договор аренды по результатам аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

В случае отказа или уклонения Участника аукциона, ставшего победителем аукциона (единственным участником аукциона), от выполнения следующих обязанностей – подписания протокола о результатах аукциона; оплаты суммы, по которой продано право заключения договора аренды; возмещения затрат на организацию и проведение аукциона; заключения договора аренды.

Участник аукциона, ставший победителем аукциона (единственным участником аукциона), **уплачивает штраф** в размере 50 базовых величин.

Если при проведении аукциона участник аукциона вместе с другим(-и) участником(-ами) аукциона согласится с объявленной аукционистом ценой, но ни один из них не согласится со следующей объявленной аукционистом ценой и после предложения аукциониста этим участникам аукциона объявит свою цену, которая должна быть выше последней цены, с которой согласились участники аукциона, ни один из этих участников не предложит свою цену, в результате чего аукцион будет признан нерезультативным, участник аукциона **уплачивает штраф** в размере 50 базовых величин.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

Телефоны для справок: (8-0162) 20-28-88,тел./факс 22-10-20.

Извещение о проведении 88-го открытого аукциона по продаже земельного участка в Солигорском районе 28 января 2019 г.

№ лота	1
Предмет аукциона	Право заключения договора аренды земельного участка
Адрес земельного участка	Минская область, г. Солигорск, микрорайон № 18, дом № 12А (по генплану)
Кадастровый номер	625050100001002956
Площадь, га	0,1372
Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества (целевое назначение)	Размещение объектов бытового обслуживания населения (строительство и обслуживание центра бытовых услуг населению)
Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории*	Имеется транспортная и инженерная инфраструктура
Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений	Земельные участки, расположенные в охранных зонах линий связи и радиофикации – 0,0241 га, сетей и сооружений канализации – 0,0637 га, сетей и сооружений газоснабжения – 0,0249 га
Начальная цена продажи, руб.	34 123,01
Сумма задатка, руб.	6 824,00
Срок аренды земельного участка / условия продажи	20 лет / 1. обеспечить соблюдение требований градостроительного паспорта земельного участка при осуществлении проектирования и строительства; 2. см. пункт 6
Затраты на организацию и проведение аукциона, руб.	2 344,22 / + затраты на объявление в СМИ

*в разделе указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте.

Продавец: Солигорский районный исполнительный комитет (далее – райисполком), 223710, г. Солигорск, ул. Козлова, 35.

Порядок проведения аукциона и порядок оформления участия в торгах определяются Гражданским кодексом Республики Беларусь, Положением о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

Аукцион состоится в 15.00 28 января 2019 г. по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 35, зал заседаний райисполкома.

2. Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы:

2.1. заявление на участие в аукционе по установленной форме; при подаче заявления представитель юридического лица должен иметь паспорт, доверенность на участие в аукционе и на подписание документов, физическое лицо (или его представитель, участвующий в аукционе по нотариально удостоверенной доверенности) – паспорт;

2.2. копии устава, учредительных документов, свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов (для юридического лица), копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования (для индивидуальных предпринимателей), копию паспорта, выписку об открытии в филиале 633 АСБ «Беларусбанк» лицевого счета для возврата задатка (для физических лиц);

2.3. документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет райисполкома (УНН 601061003) № BY75 AKBB 3641 0000 0429 7660 0000 в филиал 633 АСБ «Беларусбанк», БИК AKBBBY21633, с отметкой банка, не позднее срока окончания приема документов на участие в аукционе – 22 января 2019 г.;

2.4. гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо заключает с райисполкомом соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по установленной форме.

3. По лоту осуществляется ежегодная уплата арендной платы согласно кадастровой стоимости земельного участка и его целевому назначению.

4. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с земельным участком и документацией. Осмотр земельного участка осуществляется претендентами на участие в аукционе самостоятельно либо в сопровождении специалиста управления землеустройства райисполкома в согласованное время (рабочие дни) в течение установленного срока приема документов.

5. Аукцион состоится при наличии не менее двух участников. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов максимальную цену.

6. Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:

подписать протокол аукциона в день проведения аукциона;

в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона внести плату за предмет аукциона (в счет оплаты засчитывается сумма внесенного задатка), возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения;

не позднее 2 рабочих дней после совершения оплаты заключить с райисполкомом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок после его заключения государственную регистрацию права на земельный участок;

в течение одного месяца со дня осуществления государственной регистрации права на земельный участок обратиться в райисполком для получения разрешительной документации на проектирование и строительство объекта;

в течение двух месяцев после получения разрешительной документации на проектирование и строительство объекта заключить договор подряда на выполнение проектных работ;

обеспечить разработку проектно-сметной документации в сроки, установленные Положением о порядке определения продолжительности разработки проектной документации на строительство зданий и сооружений, утвержденным приказом Министерства архитектуры и строительства Республики Беларусь от 16 февраля 2005 г. № 40 «Об утверждении и введении изменения в технические нормативные правовые акты в строительстве»;

согласовать и утвердить в установленном порядке разработанную проектно-сметную документацию в течение трех месяцев;

юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю не позднее 6 месяцев, а гражданину не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к освоению земельного участка;

осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

7. Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Солигорск, ул. Козлова, 35, кабинет 244, с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по рабочим дням со дня опубликования настоящего извещения и по 22 января 2019 г. включительно.

Контактные телефоны: 8(0174) 22 77 46, 22 55 23.

МАНІТОРЫНГ І АЦЭНКА МЯСЦОВЫХ СТРАТЭГІЙ УСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ

Хто ў Беларусі ведае, як развіваюцца гэтыя тэрыторыі? І якія высновы з такой інфармацыі робяцца? Наш аналіз высветліў, што сур'ёзных даследаванняў, якія комплексна аналізуюць стан, напрыклад, вёсак і сельсаветаў у Беларусі, практычна няма. Рэгіянальная аналітыка часцей за ўсё адлюстроўвае стан спраў у галінах эканомікі, або, значна радзей, у раёнах. Аднак і там, і там гэтыя звесткі ўсё ж бліжэй да «сярэдняй тэмпературы па шпіталі». Бо сітуацыя ў райцэнтры (не кажучы ўжо аб цэнтры абласным) — зусім іншая, чым у вёсках, асабліва аддаленых ад вялікіх гарадоў. Што казаць, калі нават паміж вёскамі — часта дыстанцыя ў сацыяльна-эканамічным вымярэнні.

А калі мы не можам «палічыць», як развіваюцца сельсаветы і вёскі, паспрабаваць спрагназаваць іх перспектывы, то існуе рызыка прыняцця рашэнняў аб іх развіцці зверху на аснове меркаванняў вузкага кола людзей, меркаванняў часцяком хутчэй эмацыянальных, чым рацыянальных, або залішне акадэмічна-навуковых. Гэта стварае вялікую пагрозу памылак. Прычым варта ўлічваць таксама агульнае імкненне кожнай дзяржавы да спрашчэння і стандартызацыі «аб'екта» для мэт кіравання. Так, вядомы прафесар Ельскага ўніверсітэта Джэймс Скот пісаў, што «сучасная дзяржава з дапамогай сваіх чыноўнікаў спрабуе з пераменным поспехам стварыць карціну прыроды і насельніцтва (а ў нашым кантэксце — у тым ліку сельсаветаў і іншых лакальных тэрыторый. — А. С.) з такімі стандартызаванымі характарыстыкамі, якія будуць найбольш простымі пры кантролі, падліку, ацэнцы і кіраванні».

Што ж рабіць? Так, прасоўвацца ў напрамку шырэйшага мясцовага самакіравання, самаразвіцця, стварэння магчымасцяў для ўзбагачэння мясцовых супольнасцяў, у тым ліку праз фарміраванне іх рэальнай маёмасці.

І адным з шляхоў набліжэння да такой мадэлі ў сённяшняй Беларусі з'яўляецца распрацоўка і рэалізацыя мясцовых стратэгій устойлівага развіцця (УР). У перыяд з 1999-га да 2018 года ў рэгіёнах Беларусі можна налічыць каля 180 ініцыятыў, якія пазіцыянавалі сябе як удзельнікі дзейнасці па УР на мясцовым узроўні (у тым ліку пад назвай «Мясцовыя парадкі дня — 21»). У 2018 годзе з іх, па нашых ацэнках, працягваюць актыўнасць каля 140 ініцыятыў па УР, у тым ліку ў шасці абласцях, у 20 раёнах, у 50 супольнасцях пярвічнага ўзроўню (у гарадах раённага падпарадкавання, сельскіх і пасялковых Саветах, гарадах і вёсках), у пяці арганізацыях і прыкладна 60 школах і іншых навучальных установах. На гэты час у краіне апублікавана каля 40 рознай ступені дэталёвасці (ад поўных тэкстаў да тэзісаў) дакументаў рэгіянальных і мясцовых стратэгій, канцэпцый, падрыхтоўчых матэрыялаў для іх. У ліку апошніх з іх у 2017 годзе пры падтрымцы праекта «Пашырэнне эканамічных магчымасцяў у сельскай Беларусі», рэалізаванага Мясцовым інфармацыйна-асветніцкім фондам «Новая Еўразія» (г. Мінск) пры фінансаванні Еўрапейскага саюза і суфінансаванні Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці (USAID), апублікаваны стратэгіі ўстойлівага развіцця Беларусі 19 сельсаветаў, у тым ліку 15 з іх — упершыню.

Метадычны дапаможнік «Маніторынг і ацэнка эфектыўнасці стратэгій устойлівага развіцця на мясцовым узроўні» базуецца на глабальных Мэтах устойлівага развіцця ААН у іх нацыянальным праламленні ў Рэспубліцы Беларусь.

Гэтыя стратэгіі распрацаваны, апублікаваны і ажыццяўляюцца. Але як праходзяць гэтыя працэсы? Ці можна лічыць іх паспяховымі? Ці ўсё ідзе так, як планавалася або неабходны карэктывы? Такія пытанні гучаць усё часцей. І патрэбны адказы на іх, каб ісці далей.

Аднак, як высветлілася, тут не ўсё так проста. Няма (дакладней — да гэтага часу не было) методыкі для вызначэння эфектыўнасці стратэгій устойлівага развіцця на мясцовым узроўні. А менавіта ж на ўзроўні гарадоў, раёнаў і сельскіх тэрыторый распрацаваны і рэалізуюцца большасць такіх стратэгій.

Вырашыць гэтае пытанне ўзяўся праект «Эфектыўны маніторынг і ацэнка — залог паспяховай рэалізацыі стратэгій устойлівага развіцця на мясцовым узроўні». Ажыццяўляўся ён фондам «Новая Еўразія» пры фінансавай падтрымцы Праграмы падтрымкі Беларусі федэральнага ўрада Германіі з красавіка 2017 года да лістапада 2018-га. Партнёрам па праекце выступала нямецкая арганізацыя LAG-21 Зямельнае аб'яднанне «Парадак дня — XXI» зямлі Паўночны Рэйн — Вестфалія, вядомая сваімі распрацоўкамі па ўстойлівым развіцці на мясцовым узроўні і супрацоўніцтвам з беларускімі арганізацыямі, а таксама шэраг беларускіх экспертаў. Пры падрыхтоўцы дапаможніка выкарыстоўваліся таксама матэрыялы, распрацаваныя і прадстаўленыя Навукова-даследчым эканамічным інстытутам Міністэрства эканомікі Рэспублікі Беларусь.

У межах праекта па маніторынгу і ацэнцы СУРаў (так скарочана называюць стратэгіі ўстойлівага развіцця) зроблена многае. Сабрана і прааналізавана інфармацыя аб існуючых стратэгіях і наяўныя метадычныя падыходы да іх распрацоўкі і ацэнкі. У прыватнасці, у аснову прапанаванага інструмента пакладзены сем базавых прынцыпаў ESDN — Еўрапейскай сеткі ўстойлівага развіцця, якія пастаянна павінны знаходзіцца ў полі зроку распрацоўшчыкаў і рэалізатараў СУР. Прынцыпы, на якіх будуецца канцэпцыя маніторынгу і ацэнкі, такія:

1) Агульнае бачанне будучыні і стратэгічныя мэты, якія падзяляюцца ўсімі (пры распрацоўцы СУР меркаванні і пажаданні ўсіх зацікаўленых бакоў павінны быць пачутыя і ўлічаныя);

2) Высокая ступень палітычнай падтрымкі (распрацоўку СУР і іх рэалізацыю варта ажыццяўляць пры актыўным удзеле і падтрымцы мясцовых органаў улады і кіравання, што таксама дазваляе аб'яднаць існуючыя рэсурсы);

3) Гарызантальная інтэграцыя (неабходна ўлічваць узаемны ўплыў розных кірункаў дзейнасці і ўцягваць у работу шырокае кола зацікаўленых бакоў, спецыялістаў рознага профілю, напрыклад, эканомікі, сацыяльнай сферы, экалогіі і інш.);

4) Вертыкальная інтэграцыя (мэты і задачы лакальных СУР не павінны супярэчыць стратэгіям больш высокага ўзроўню і міжнародным дакументам);

5) Удзел, партнёрства («нікога не пакінуць збоку» — такое абавязацельства ўзялі на сябе падпісанты Дэкларацыі ААН, якія прынялі Мэты ўстойлівага развіцця на перыяд да 2030 года);

6) Механізмы ўкаранення і пошук рэсурсаў (важна мець яснае ўяўленне пра тое, якімі рэсурсамі валодаюць зацікаўленыя бакі і якім чынам рэсурсы можна прыцягваць);

7) Маніторынг, ацэнка і карэкціроўка (для забеспячэння працэсу кіравання ўстойлівага развіцця тэрыторыі неабходна прадугледзець механізмы маніторынгу, ацэнкі і карэкціроўкі мэт, задач, тэрмінаў, бюджэтаў і іншых параметраў СУР).

«Выкананне вышэйпералічаных прынцыпаў або, па меншай меры, імкненне да іх рэалізацыі робіць працэс стратэгічнага развіцця тэрыторыі актуальным, рэалістычным і сапраўды ўстойлівым», — падкрэсліваецца ў каментарыі да інструмента маніторынгу і ацэнкі.

У працэсе распрацоўкі інструмента маніторынгу праведзены кансультацыі з айчыннымі і замежнымі экспертамі. Распрацаваны праект інструмента маніторынгу прайшоў апрабацыю «ў палявых умовах»: адбыліся сустрэчы-гутаркі з распрацоўшчыкамі і выканаўцамі мясцовых стратэгій устойлівага развіцця ў некалькіх раёнах Беларусі. У прыватнасці, асобныя элементы інструмента былі прадстаўлены, абмеркаваны на прадмет рэалістычнасці, даступнасці даных у вёсцы Чамарысы Брагінскага раёна і вёсцы Крывое Сяло Вілейскага раёна. На падставе аналізу рэкамендацый ад будучых непасрэдных карыстальнікаў у інструмент унесены ўдакладненні і карэкціроўкі. Праведзена апрабацыя непасрэдна ў мэтавых тэрыторыях — Відамлянскім сельскім Савеце Камянецкага раёна і Жалудоцкім сельскім Савеце Шчучынскага раёна.

Аднак любыя методыкі і інструменты мёртвыя, калі яны не выкарыстоўваюцца прафесійна, спецыяльна падрыхтаванымі людзьмі. Таму адно з ключавых мерапрыемстваў праекта — правядзенне спецыялізаванага семінара-трэнінгу па маніторынгу і ацэнцы стратэгій развіцця на мясцовым узроўні з выкарыстаннем падрыхтаванага інструмента. У семінары 6—7 верасня прынялі ўдзел 18 прадстаўнікоў ініцыятыўных груп па ўстойлівым развіцці сельскіх тэрыторый, якія выказалі жаданне і гатоўнасць прайсці профільнае навучанне і пасля праводзіць маніторынг і ацэнку на рэгулярнай аснове. У анкетах зваротнай сувязі, у прыватнасці, мы чытаем: «Важна, што прапанаваная методыка — гэта не догма, яна не выключае творчасці»; «Я зразумеў, як стварыць алгарытм групавой дыскусіі для найбольшай эфектыўнасці»; «Атрыманы досвед я змагу прымяніць на сваёй тэрыторыі», «Пасля трэнінгу прыйдзецца дапрацаваць стратэгію».

Як паказаў заключны круглы стол па выніках праекта, праведзены 12 лістапада, практычна ўсе тэрыторыі, якія ўдзельнічалі ў праекце, пачалі актыўнае прымяненне інструмента або яго элементаў. Так, гэта часам няпроста і патрабуе шмат часу і інтэлектуальных выдаткаў, але інакш і быць не можа, бо гаворка ідзе пра стратэгію развіцця цэлай тэрыторыі, стратэгію, якая закранае інтарэсы сотняў і тысяч людзей.

Заключны круглы стол пацвердзіў, што ўдзельнікі праекта — мэтанакіраваныя актывісты ўстойлівага развіцця, прафесіяналы сваёй справы, сябры і паплечнікі.

Эксперт з Германіі Марцін Шон-Чанішвілі, які ў свой час працаваў у арганізацыі LAG — 21 Зямельнае аб'яднанне «Парадак дня — XXI» зямлі Паўночны Рэйн — Вестфалія так гаворыць пра новую апублікаваную методыку: «Такая распрацоўка вельмі актуальная не толькі для Беларусі, а і на міжнародным узроўні. Так, у Германіі зараз вялікая колькасць населеных пунктаў і сельскіх тэрыторый распрацавалі і ажыццяўляюць мясцовыя стратэгіі ўстойлівага развіцця. Такія дакументы дазваляюць канцэнтраваць высілкі на прыярытэтных кірунках развіцця і выкарыстоўваць патэнцыял мясцовых супольнасцяў. Маніторынг і ацэнка стратэгій устойлівага развіцця — важныя крокі ў гэтых працэсах. І беларуская распрацоўка тут — сапраўды інавацыйны і эфектыўны інструмент для павышэння эфектыўнасці стратэгій. Мы ў Германіі таксама працуем у гэтым кірунку».

Эксперты звяртаюць таксама ўвагу на тое, што ў Метадычным дапаможніку забяспечаная звязка сістэмы індыкатараў для ацэнкі мясцовых СУРаў з Мэтамі ўстойлівага развіцця, прынятымі Арганізацыяй Аб'яднаных Нацый у 2015 годзе ў якасці арыенціраў стратэгіі на перыяд да 2030 года. Такім чынам, ствараюцца дадатковыя перадумовы для рэалізацыі шырока вядомага ў галіне ўстойлівага развіцця арыенціра-закліку «Думаць глабальна, дзейнічаць лакальна». Не засталіся па-за ўвагай аўтараў дапаможніка і пытанні забеспячэння гендарнай роўнасці ў працэсах распрацоўкі і ажыццяўлення стратэгій устойлівага развіцця на мясцовым узроўні.

Удзельнікі семінара-трэнінгу па вывучэнні інструмента маніторынгу і ацэнкі. Генадзь ЦЫВІНСКІ — крайні справа.

Добра адносіцца да новага інструмента для работы па развіцці тэрыторый і беларускія практыкі ўстойлівага развіцця. **Старшыня Жалудоцкага сельсавета Шчучынскага раёна Генадзь ЦЫВІНСКІ** кажа: «Наш пасёлак — ужо не пачатковец у працэсах устойлівага развіцця. У нас створаны Каардынацыйны савет па гэтай тэматыцы, распрацаваны і надрукаваны ўжо тры стратэгіі ўстойлівага развіцця, рэалізаваны некалькі практычных праектаў. Так, напрыклад, ужо на ўзроўні краіны вядомы наш штогадовы Фестываль кветак. Плошчу нашага пасёлка ўпрыгожваюць каменныя скульптуры — вынік пленэру «Жалудок здзяйсняе мары». Абсталяваны інфармацыйны цэнтр па ўстойлівым развіцці і міні-музей. Сабраны матэрыялы пра гісторыю пасёлка і надрукаваны некалькі брашур. Зарэгістравана і працуе грамадская арганізацыя па развіцці вясковых тэрыторый «Наш край». Удзельнічалі мы і ў гэтым праекце фонду «Новая Еўразія». Да нас прыязджалі эксперты, і нашы прадстаўнікі ездзілі ў Мінск для ўдзелу ў семінарах-трэнінгах. Мы лічым, што вельмі важна ўмець ацэньваць выніковасць стратэгій устойлівага развіцця. Інакш камусьці можа здацца, што гэтыя справы не ўплываюць на развіццё пасёлка і сельсавета. А зараз на практычных трэнінгах мы ўжо зрабілі некаторыя разлікі, параўналі сітуацыю «перад» і «пасля», і цяпер з лічбамі ў руках можам даказаць эфектыўнасць нашай працы. Гэта важна і для саміх людзей — актыўных удзельнікаў мерапрыемстваў і праектаў. Бо добрыя індыкатары адначасова — гэта і адзнака іх працы, і своеасаблівыя арыенціры на будучыню. Яны дапамагаюць працаваць на перспектыву».

Такім чынам, з'явіліся новыя магчымасці прычыніцца да работы па ўстойлівым развіцці розных куточкаў нашай Бацькаўшчыны ці павысіць эфектыўнасць працы, што ўжо ідзе. «Метадычны дапаможнік па маніторынгу і ацэнцы эфектыўнасці рэалізацыі стратэгій устойлівага развіцця на мясцовым узроўні» можна знайсці на сайце фонду «Новая Еўразія» http://eurasia.by/about/our-publications. Добрага вам чытання і плёну ў працы! Дзеля ўстойлівага сёння і будучыні.

Алег СІВАГРАКАЎ,
загадчык кафедры эканомікі і кіравання Інстытута прадпрымальніцкай дзейнасці, кандыдат эканамічных навук, дацэнт.

УНП 190601601

НОВАЯ ЕВРАЗИЯ
Förderprogramm Belarus

Праект «Эфектыўны маніторынг і ацэнка — залог паспяховай рэалізацыі стратэгій устойлівага развіцця на мясцовым узроўні» фінансуецца Праграмай падтрымкі Беларусі федэральнага ўрада Германіі.

КРОКІ ДА ЭКАЛОГІІ

МАРКЕТЫНГ НЕ ЗАЎЖДЫ НА КАРЫСЦЬ

Падводзім вынікі нашай фінальнай у адыходзячым годзе экалагічнай апытанкі. Гэтым разам мы вырашылі крыху адысці ад звычнага фармату і прапанавалі чытачам інтэрактыўны тэст.

У першым заданні мы папрасілі расставіць у прыярытэтным парадку варыянты абыходжання з адходамі так, каб паменшыць іх колькасць. Прыемна, што большасць тых, хто прагаласаваў, выбрала радок, дзе прыярытэтнасць дзеянняў была пералічана правільна. Гэта зрабілі 52 %. Правільны пералік выглядае так: адмаўляцца ад непатрэбнага; паўторна выкарыстоўваць; перапрацоўваць; кампаставаць; спальваць; захоўваць. Праўда, трыццаць працэнтаў рэспандэнтаў выказаліся за паслядоўнасць, дзе першым пунктам было пазначана спальванне.

Датычна аб'ёму перапрацоўваемага смецця большасць рэспандэнтаў таксама выказалася за правільны варыянт. Так, 68 % апытаных адказалі, што ў Беларусі перапрацоўваецца каля 18 % адходаў. Праўда, 22 % абралі песімістычны адказ — яны палічылі, што аб'ём рэцыклінгу ў краіне не перавышае трох працэнтаў. Іх аказалася меней, чым аптымістаў — кожны дзясяты галасаваў за тое, што ў нас на перапрацоўку адпраўляецца каля 90 % смецця. Што ж, будзем упэўнены, што ў не вельмі далёкай перспектыве так і будзе.

Рэспандэнты таксама парадавалі сваёй экалагічнай адказнасцю. Напрыклад, мы прапанавалі змадэляваць наступную сітуацыю, якая мела месца быць. Мінакі ішлі і ўбачылі, што смецце згружаюць з розных кантэйнераў у адну машыну. Што рабіць? Тры чвэрці апытаных заявілі, што яны патэлефануюць па нумары 115 і паведамяць пра тое, што адбываецца. Яшчэ чвэрць абрала кампрамісны варыянт — працягваць сартаваць, але хай камунальныя службы разбіраюцца самі. Адметна, што ніхто не апусціў рукі і не перастаў займацца разборам адходаў.

А вось маркетынг, шчыра кажучы, згуляў на 100 %. Толькі 42 % апытаных пагадзіліся з меркаваннем эколагаў, што папяровыя кубачкі для кавы не з'яўляюцца больш экалагічнымі за пластыкавыя.

Наступнае пытанне аказалася куды цяжэйшым. Мы прапаноўвалі выбраць з многіх варыянтаў адказу віды смецця, якое можна перапрацаваць у нашай краіне. Безумоўнага пераможцы тут няма. Але 40 працэнтаў тых, хто прагаласаваў, выбралі правільны пералік: металічныя бутэлькі ад газіроўкі; тэтрапакі; пакеты ад макароны і круп; пластыкавыя бутэлькі ад малака; бутэлькі ад мыйных сродкаў.

А вось на пытанні аб тым, куды падзець сапсаваную лямпачку, большасць апытаных якраз і «пракалолася». Яе можна выкінуць у кантэйнер для звычайнага смецця. А амаль палова прагаласавала за тое, што для гэтага спатрэбіцца спецыяльны кантэйнер для небяспечных адходаў. Але гэта ж не люмінесцэнтная лямпа, якая ўтрымлівае пары ртуці.

Хочацца асобна спыніцца на пытанні, прысвечаным іншаму абыходжанню з адходамі, апрача перапрацоўкі. Тут галасы раздзяліліся. 40 працэнтаў чытачоў лічаць, што ў нас яшчэ адходы кампастуюць. Яшчэ ж столькі лічаць, што іх не кампастуюць, не спальваюць для атрымання паліва і не робяць з іх гаручае ўвогуле. І менавіта яны маюць рацыю.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

ЧЫСТАЯ ЭНЕРГІЯ З БРУДНАЙ ЗЯМЛІ

У Чэрыкаўскім раёне з'явіцца самы буйны сонечны парк

Айчынная будаўнічая кампанія «Белзамежбуд» налета скончыць узвядзенне найбуйнейшай для нашай краіны фотаэлектрычнай станцыі (ФЭС) магутнасцю 109 МВт. Кантракт на будаўніцтва гэтага аб'екта быў заключаны днямі з заказчыкам праекта — кампаніяй «Солар Лэнд».

Дырэктар кампаніі Мікіта МІХНЕВІЧ паведаміў, што парк сонечнай энергіі будзе ўяўляць сабой размешчаныя на спецыяльнай падсістэме модулі, якія збіраюць сонечную энергію. Пад фотаэлектрастанцыю выдзелены ўчастак у 220 гектараў. Сам зямельны ўчастак размешчаны прыкладна за 300 кіламетраў на ўсход ад Мінска, паміж райцэнтрамі Чэрыкаў і Крычаў, у раёне вёскі Бліжняя Рэчыца. Згодна з праектам, станцыя размесціцца на землях, якія падвергліся радыяцыйнаму ўздзеянню падчас чарнобыльскай аварыі.

ФЭС запрацуе ў маі наступнага года

«Работы па ўзвядзенні электрастанцыі распачалі сёлета ў верасні. Атрыманая энергія будзе пастаўляцца ў энергасістэму Беларусі, — растлумачыў Мікіта Міхневіч. — Гэты праект не прынясе вялікага даходу, але ён цікавы сваёй стабільнасцю і перспектыўнасцю».

Пры будаўніцтве аб'екта будзе задзейнічана вялікая колькасць мясцовага насельніцтва. Пры мантажы модуляў на пляцоўцы будзе максімальна працаваць да тысячы спецыялістаў і рознарабочых.

У красавіку — маі наступнага года электрастанцыю плануюць увесці ў строй. Эксплуатацыяй будуць займацца каля 30 высокакваліфікаваных спецыялістаў. Калі інвестар плануе атрымаць прыбытак ад укладання сваіх сродкаў? Заказчык ухіліўся ад адказу на гэтае пытанне, спасылаючыся на камерцыйную таямніцу. І тут жа дадаў, што час акупнасці праекта складае больш за 10 гадоў.

Эканомія валютных сродкаў

Будаўніцтва станцыі накіравана на развіццё экалагічна чыстай сонечнай энергетыкі ў нашай краіне і дыверсіфікацыю крыніц электраэнергіі. Чакаецца, што праект паспрыяе эканоміі валютных рэсурсаў за кошт некаторага скарачэння імпарту нафты і газу.

Агульная сума інвестыцый у праект перавысіць 170 мільёнаў долараў. Фінансуецца ён за кошт крэдытных рэсурсаў і ўласных сродкаў «Солар Лэнд» — даччынага прадпрыемства ірландскай кампаніі «Камеліасайд Лімітэд», якая ўваходзіць у групу кампаній United Green. Гэтая група кампаній займаецца інвеставаннем у праекты аднаўляльнай энергетыкі па ўсім свеце.

Сяргей КУРКАЧ.

Пад будучую паліклініку ў Мёрах адводзіцца ўчастак у 1,46 га

Сёння, 28 снежня, заканчваецца грамадскае абмеркаванне архітэктурна-планіровачнай канцэпцыі будаўніцтва новай паліклінікі ў райцэнтры, паведамляюць «Міёрскія навіны».

Пад будучую раённую паліклініку адводзіцца ўчастак у 1,46 гектара па вуліцы Камуністычнай за пляцоўкай для стаянкі транспарту ЦРБ, на пустэчы перад скрыжаваннем з аб'язной дарогай Полацк — Браслаў. Будынак вялікі, трохпавярховы, пры плошчы забудовы крыху больш за 1538 квадратных метраў. Агульная плошча памяшканняў набліжаецца да 5860 «квадратаў». Плануецца стварэнне парковак для транспарту наведвальнікаў і персаналу, дзіцячай і іншых пляцовак, рэкрэацыйнай (зялёнай) зоны.

Паліклініка разлічана на 125 наведванняў у змену дарослым насельніцтвам, яшчэ на 30 — жаночай кансультацыі і 45 — педыятрычнага аддзялення. Яна ўключана ў дзяржаўную інвестыцыйную праграму.

У Бешанковічах ёсць вакансіі для жанчын

Як паведамілі раённай газеце «Зара» ва ўпраўленні працы, занятасці і сацыяльнай абароны райвыканкама, прыватнае вытворча-гандлёвае ўнітарнае прадпрыемства «ТАНДЗІПАК» адкрывае ў райцэнтры новую вытворчасць, якая будзе займацца выпускам упаковачнай тары. Сюды на работу тэрмінова патрабуецца 15 жанчын, якія будуць працаваць зборшчыцамі ўпаковачнай тары (зарплата здзельна-прэміяльная).

❍ У ТЭМУ

Як на Браслаўшчыне развіваюць альтэрнатыўную энергетыку

Піянерам укаранення на Браслаўшчыне тэхналогіі па пераўтварэнні энергіі сонца ў цеплавую стаў Відзаўскі каледж, які яшчэ ў 2010 годзе рэалізаваў праект «Чысты свет» з установкай геліякалектара магутнасцю 15 кВт гадзін на суткі, паведамляе раённая газета «Браслаўская звязда».

У 2014 годзе ў межах рэалізацыі чарговага праекта «Погляд у будучыню» пры падтрымцы Глабальнага фонду ПРААН быў усталяваны і другі модуль магутнасцю 35 кВт/г на суткі. Калі ўлічыць, што эфектыўная работа ўстаноўкі сумарнай магутнасцю 50 кВт/г разлічана пры дастатковай інсаляцыі на 215 дзён у годзе (з 15 сакавіка да 15 кастрычніка), то яна штогод эканоміць 10 750 кВт/г. Тым не менш тэрмін яе акупнасці даволі працяглы — каля 10 гадоў.

З пачатку 2015 года сістэма, заснаваная на пераўтварэнні энергіі сонца ў цеплавую, стала падаграваць ваду для душавых у спартыўнай школе, а летам бягучага года геліяўстаноўкі пачалі працаваць у яслях-садку № 1 і ў гімназіі. У садку, напрыклад, з дзевяці электрабойлераў, якія забяспечваюць патрэбы дашкольнай установы ў гарачай вадзе, у летнія месяцы выкарыстоўваўся толькі адзін на кухні, а для бытавых патрэб груп цалкам хапала гарачай вады, што выраблялася сонечнымі калектарамі.

www.braslav-star.by

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.,** намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.,** намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.,** старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.,** старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.,** старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. **Нумар падпісаны ў 19.30 27 снежня 2018 года.**